Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 139 (6416) | 20 чэрвеня 1939 г., аўторак | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Другі ўсебеларускі з'езд сельскіх урачоў (1 стар.).

Прамысловасць Гомеля выканала поўгадовую праграму (1 стар.).

Пасяджэнне Совета Народных Камісараў БССР (1 стар.).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ. **І. А. Кіслік** — Оргінструктарскі аддзел абкома партыі. **І. Шатрукоў** — Наш вопыт палітмасавай работы. **З. Мяцеліца** — Арганізатар самастойнага вывучэння гісторыі ВКП(б) (2 стар.).

ЗА ЧЭСЦЬ ФАБРЫЧНАЙ МАРКІ. **Б. Я. Рабкін** — Канферэнцыя па якасці. (2 стар.).

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ. **П. Фаменка, А. Шэстак** — Пісьмы патрыётаў.

АРТЫКУЛЫ: **В. С. Гладкі** — За паляпшэнне якасці медыцынскай дапамогі на сяле. **С. Майсееў** — Ваенна-марскія сілы. **Сергей Радлоў** — Совецкае мастацтва служыць народу.

Поўнасцю адрамантаваць сельскагаспадарчыя машыны. К. Пырх — У Гарадку не рыхтуюць уборачныя машыны. **Е. Стасельна** — Выконваем пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР. **А. Халупняк** — Строга ахоўваць калгасныя землі ад раскрадвання. (3 стар.).

ЗА РУБЯЖОМ. Ваенныя дзеянні ў Кітаі. Прабыванне Гафенку ў Анкары. Становішча ў Чэха-Славакіі. Надыходзячы падзел Славакіі. Блакада замежных канцэсій у Цяньцзіне і Гулансу. Кітайская газета аб А. М. Горкім. Гібель французскай падводнай лодкі «Фенікс». (4 стар.).

НОВЫЯ ШКОЛЫ БУДАВАЦЬ ХУТКА І ВЫСОКАЯКАСНА

XVIII гістарычны з'езд ВКП(б) намеціў велічную праграму сацыялістычных работ у трэцяй сталінскай пяцігодцы. Выкананне гэтай праграмы зробіць нашу краіну яшчэ больш магутнай, заможнай і культурнай. Вялікія залачы пастаўлены і ў галіне росту народнай асветы. Асноўным і рашаючым з'яўляецца поўнае завяршэнне справы ўсеагульнага абавязковага 7-гадовага навучання на вёсцы і стопроцантны ахоп дзяцей сярэдняй школай у гарадах.

Ажыццяўленне такой гіганцкай задачы патрабуе максімальна павялічваць будаўніцтва новых прасторных і светлых сталінскіх школ, паляпшаць якасць выкладання, рыхтаваць высокаякасныя педагагічныя кадры. Совецкая дзяржава асігноўвае велізарнейшыя сродкі на справу народнай асветы. У 1939 годзе толькі ў нашай рэспубліцы бюджэтам прадугледжана асігнаванне на будаўніцтва 91 новай школы. Гэта сведчыць пра няўхільныя клопаты партыі Леніна—Сталіна, совецкага ўрада аб патрэбах народа, аб росце яго культуры.

Будаўніцтва новых школ з'яўляецца адной з важнейшых умоў паспяховага выканання задачы, пастаўленай у трэцім пяцігодзі ў галіне народнай асветы. Яно павінна быць так арганізавана, каб новыя школы ўступалі ў эксплаатацыю ў тэрміны, вызначаныя ўрадам. Па БССР у гэтым годзе павінна быць пабудавана 13 гарадскіх і 78 сельскіх школ на 19 тысяч новых вучнёўскіх месц. Да пачатку новага вучэбнага года ізевятнаццацітысячная армія школьнікаў павінна мець новыя, чыстыя, прасторныя памяшканні для заняткаў. Адсюль грандыёзнасць і важнасць хуткага і добраякаснага будаўніцтва новых школ відавочна.

Аднак, з усёй рашучасцю трэба канстатаваць, што ўрадавыя тэрміны будаўніцтва новых школ па рэспубліцы ганебна зрываюцца, тэмпы тэхнічнай гатоўнасці школ пагражаюча нізкія. Так, на першыя чысты чэрвеня па ўстаноўленаму СНК БССР плану гарадскія школы павінны былі мець 50 проц. тэхнічнай гатоўнасці, а мелі па вестках Наркамасветы ўсяго 38. Толькі адзе гарадскія школы (у Магілеве) будуюцца больш-менш паспяхова. У такіх-жа гарадскіх пасёлках, як Парычы, Ушачы, Копысь і інш., пропант тэхнічнай гатоўнасці школ не перавышае 25.

Яшчэ больш ганебнае становішча з будаўніцтвам у сельскай мясцовасці, на якую падае асноўная колькасць новабудуючыхся школ. І тэмпы тут павінны былі быць найбольш хуткімі. Але гэтага няма. Замест 55 проц. тэхнічнай гатоўнасці новыя школы маюць (будаўніцтва гэтага года) толькі... 9 проц. і не больш 70 проц. па пераходзячаму будаўніцтву з мінулых год. Абуральчыя факты маюць месца ў такіх раёнах, як Хойніцкі, дзе будаўніцтва каменнай школы на 280 месц амаль не распачата. Райвыканком не ўдасужыўся забяспечыць будаўнічы аб'ект матэрыяламі першай неабходнасці. У Старобінскім раёне таксама будаўнічых матэрыялаў у патрэбнай колькасці не завезена і будаўніцтва школы зрываецца.

Такое становішча не толькі па новым будаўніцтве. Нават на пераходзячым ёсць абуральчыя факты. Вось, напрыклад, у Хопімску ўжо два годы будуецца школа. Дзяржплан, упраўленне будаўніцтвам школ Наркамасветы і РВК і ў гэтым годзе мер да заканчэння будаўніцтва не прымаюць і ў выніку тэхнічная гатоўнасць школы не больш 60 проц.

Зрыў выканання плана работ выключна важнага будаўнічага задання з'явіўся вынікам безадказных адносін да школьнага будаўніцтва з боку оргкамітэтаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР па абласцях, аддзелаў народнай асветы і ў асаблівасці райвыканкомаў. Такія райвыканкомы, як Ветрынскі, Суражскі, Дрысенскі, Мозырскі, Рэчыцкі, Журавіцкі і інш., непасрэдна адказваючыя за будаўніцтва, адыйшлі ў бок ад гэтай справы, перадаверылі будаўніцтва другарадным асобам, а часам і проста забылі аб ім. У выніку на будаўніцтвах адсутнічае матэрыял першай неабходнасці (лес, пясок, камень), рабочая і цягавая сіла.

Не забяспечваюць у тэрмін будаўніцтва новых школ (асабліва ў сельскай мясцовасці) і будаўнічыя арганізацыі. Так, Магілеўскі і Гомельскі абласныя будаўнічыя трэсты школамі займаюцца дрэнна, не забяспечваюць іх своечасова рабочай сілай. Відавочна, кіраўнікі гэтых трэстаў або не паважаюць падпісаныя з органамі народнай асветы ўмовы, або злачынна міраццца з тым, што будаўніцтва замаражваецца, пераносіцца на другі год і становіцца неэфектыўным. Нельга такой практыкі цярпець. Будаўнікі павінны быць патрабавальнымі да сябе і да арганізацый, тармозячых будаўніцтва важнейшых аб'ектаў.

СНК БССР устанавіў, што прычынай зрыву ўрадавых тэрмінаў будаўніцтва новых школ з'яўляецца і тое, што Дзяржплан БССР у першым паўгоддзі забяспечыў будоўлі фондамі лесаматэрыялаў толькі на 50 проц. і пэментам — на 58 проц. патрэбнасці. Гэта прывяло да згортвання работ нават на тых будоўлях, якія мелі магчымасць весці работу па графіку. Наркамат мясцовай прамысловасці да апошніх дзён не забяспечвае яшчэ планавай адгрузкі вапны і пэглы ў многія раёны (Асіповічы, Кіраўск і інш.). Такое становішча ніяк нельга лічыць нармальным.

СНК БССР прапанаваў Дзяржплану і Наркаммясцпрому прыняць усе меры для забеспячэння школьнага будаўніцтва неабходнай колькасцю матэрыялаў, а оргкамітэтам і райвыканкомам забяспечыць будоўлі рабочай і цягавай сілай, з тым, каб новыя гарадскія і сельскія школы былі гатовы да першага жніўня. Каб здаць новыя школы ў эксплаатацыю да першага жніўня неабходна самым рашучым чынам паляпшць тэмпы будаўніцтва.

Трэба таксама ўстанавіць строгі грамадскі кантроль за ходам будаўніцтва, прыцягваць да суровай адказнасці зрыўшчыкаў, усіх тых, хто сваімі неахайнымі адносінамі да інтарэсаў совецкай школы тармозіць будаўніцтва.

І, нарэшце, нельга далей цярпець тую практыку, якая мае месца ўжо на працягу некалькіх год, калі дапускаецца перанос будаўніцтва на наступны год. Рост кантынгента навучаючыхся і ліквідацыя змен патрабуюць будаваць школы хутка, высокаякасна, не дапускаючы ганебнай «пераходзячасці». Школы, пачатыя будаўніцтвам у гэтым годзе, павінны быць закончаны таксама ў гэтым годзе — вось прамая задача, якая няўхільна павінна быць выканана.

Краіна наша расце і мацнее. Расце і шырыцца культура, асвета. Будаўніцтва новых школ — адна з галоўных умоў паспяховага ажыццяўлення гістарычнай задачы трэцяй пяцігодкі — завяршыць усеагульнае 7-гадовае абавязковае навучанне на вёсцы і ахапіць усіх дзяцей школьнага ўзросту сярэдняй школай у гарадах. Таму трэба ліквідаваць ганебнае адставанне і забяспечыць высокаякаснае і ў тэрмін будаўніцтва новых школ. Абавязак партыйных арганізацый — пабольшэвіцку ажыццявіць задачу кантролю за ходам выканання гэтай важнейшай зараз работы на фронце культуры.

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ ГОМЕЛЯ ВЫКАНАЛА ПОЎГАДОВУЮ ПРАГРАМУ

ГОМЕЛЬ, 19 чэрвеня. (БЕЛТА). Прамысловасць Гомеля ў спаборніцтве з прадпрыемствамі Віцебска дабілася значных поспехаў. 18 чэрвеня прадпрыемствы горада выканалі поўгадовую праграму. Выпушчана прадукцыі на 113.290.800 рублёў. Поўгадовую праграму перавыканалі 16 прадпрыемстваў горада.

Тлушчакамбінат, які выканаў поўгадовы план на 107,7 проц., даў звыш плана тлушчавых прадуктаў на 1.165.000 рублёў, мельнічны камбінат даў прадукцыі звыш плана на 658 тысяч рублёў.

ПРАМЫСЛОВАЯ КААПЕРАЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ ВЫКАНАЛА ПОЎГАДОВУЮ ПРАГРАМУ

Прамысловая кааперацыя рэспублікі 18 чэрвеня выканала план першага паўгоддзя. Выпушчана прадукцыі на 248.788 тысяч рублёў.

Да канца месяца промарцелі далуць прадукцыі звыш плана на 16 мільёнаў рублёў. (БЕЛТА).

ДА 1 ЛІПЕНЯ ВЫКАНАЕМ СЕЗОННЫ ПЛАН ТОРФАЗДАБЫЧЫ

(Гутарка па тэлефону з брыгадзірам т. Макавецкім)

Рэдакцыя газеты «Звязда» звязалася па тэлефону са знатным тарфянікам рэспублікі, брыгадзірам торфазавода «Чырвоны сцяг» Грыгорыем Сямёнавічам Макавецкім.

Наш карэспандэнт папрасіў тав. Макавецкага расказаць, як ён дабіўся бліскучага рэкорда, выпрацаваўшы за змену 111.200 торфацаглін.

Вось што паведаміў Грыгорый Сямёнавіч:

— На торфазаводзе «Чырвоны сцяг» працую другі год. Месяц таму назад дырэкцыя вылучыла мяне брыгадзірам раней адстаючай брыгады элеватарнай машыны № 6. Прышлося многа папрацаваць над ліквідацыяй прарыву.

З чаго я пачаў?

Звычайна многія рабочыя брыгады ў сувязі з дрэнной арганізацыяй працы значную частку рабочага дня прастойвалі. Пасля правільнай расстаноўкі людзей гэтыя прастоі былі ліквідаваны. Асабістым прыкладам я паказваў маладым тарфянікам, як трэба рацыянальна скарыстоўваць інструмент, лепш авалодваць сваім працэсам.

З дня на дзень наш невялічкі дружны калектыў набіраў усё новыя і новыя стаханаўскія тэмпы. Брыгада пачала выходзіць у перадавыя па заводу.

13 чэрвеня работа ў нас асабліва спорылася. Ні адна мінута не была затрачана даремна. Тарфянікі з энтузіязмам змагаліся за выкананне ўзятага абавязацельства. Калі мы за дзве гадзіны да сканчэння работы падлічылі выпрацоўку, то аказалася, што здабылі ўжо 84 тыс. торфацаглін. За апошнія дзве гадзіны мы далі яшчэ 27 тыс. 200 цаглін. І такім чынам, дзённая норма была выканана на 295 проц. Такой высокай выпрацоўкі завод яшчэ не ведаў.

Для таго, каб прапусціць за змену 111.200 торфацаглін, падкладчык дошчачак павінен быць выключным майстрам сваёй справы. Такім і з'яўляецца падкладчык нашай брыгады.

Наша элеватарная машына амаль не ведае выпадкаў прастою. У гэтым вялікая заслуга слесара тав. Шурбіна.

За 15 дзён чэрвеня мая брыгада выканала сваё задание на 137,5 проц. Спаборнічаючая з намі брыгада тав. Дыцава, якая працуе на машыне № 4, за гэты час дала 130,2 проц. задання.

Калектыў брыгады абавязаўся замацаваць дасягнутыя поспехі і выканаць да 1 ліпеня сезонны план торфаздабычы. Не сумняваюся, што і на гэты раз сваё слова стрымаем.

Дэлегаты другога Ўсебеларускага з'езда сельскіх урачоў, узнагароджаныя значкамі выдатнікаў аховы здароўя. НА ЗДЫМКУ (злева направа): загадчык Астровенскага больнічнага амбулаторнага ўчастка, Бешанковіцкага раёна, тав. Е. А. Баднёў; загадчык Горвальскага больнічнага ўчастка, Рэчыцкага раёна, тав. М. М. Глухоўскі; урач Сеннянскага раёна Н. Ю. Дзянісава; загадчык Жыткавіцкага райаддзела аховы здароўя Ф. Т. Яцкевіч; загадчык Касцюковіцкага райаддзела аховы здароўя Д. М. Варшаўчык і загадчык добрушскай санэпідэмстанцыі Н. К. Цівако.

Фото Я. Салавейчыка.

II УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД СЕЛЬСКІХ УРАЧОЎ

18 чэрвеня раніцою пасяджэнне другога ўсебеларускага з'езда сельскіх участковых урачоў пачалося з даклада намесніка наркома аховы здароўя СССР тав. Грашчанкова аб задачах аховы здароўя ў трэцяй пяцігодцы.

Аналізуючы вынікі выканання другой сталінскай пяцігодкі ў галіне аховы здароўя, дакладчык указвае на вялікія поспехі, атрыманыя за прайшоўшы перыяд.

— Гэтыя поспехі аднак, — гаворыць дакладчык, — не даюць права заявіць, што органы аховы здароўя спраўляюцца з ускладзенымі на іх велізарнымі задачамі, бо працуюць яны ўсё яшчэ нездавальняюча.

Дакладчык выкладае грандыёзную праграму трэцяй пяцігодкі ў галіне аховы здароўя.

Тав. Грашчанкоў рэзка крытыкуе органы аховы здароўя БССР за нездавальняючую работу па разгортванню сеткі бальнічных коек (план другой пяцігодкі выканан толькі па 63 проц.), адкрыццю пастаянных і сезонных яслёў, па ўкамплектаванню кадрамі сельскіх урачэбных участкаў. Не гледзячы на значнае зніжэнне колькасці інфекцыйных захворванняў, усё-ж работа органаў аховы здароўя БССР і ў гэтай галіне астаецца нездавальняючай.

На раніцішнім пасяджэнні з'езд заслухаў даклад наркома аховы здароўя БССР тав. Новікава аб выкананні пастановы СНК СССР «Аб умацаванні сельскага ўрачэбнага ўчастка» і чарговых задачах па паляпшэнню лячэбна-прафілактычнай дапамогі на вёсцы. Дакладчык прывёў рад даных аб значных поспехах у галіне аховы здароўя ў беларускай вёсцы. Аднак, прызнаўшы, што пастанова СНК СССР выконваецца нездавальняюча, тав. Новікаў больш чым у двухгадзінным дакладзе «не знайшоў» часу ўскрыць канкрэтныя прычыны і вінаўных гэтага.

На вячэрнім пасяджэнні з'езда быў заслухан даклад урача астровенскай участковай больніцы, Бешанковіцкага раёна, тав. Баднёва аб арганізацыі лячэбна-прафілактычнай дапамогі на сельскім урачэбным участку.

Затым пачаліся спрэчкі па ўсіх дакладах. Урач лесніянскай больніцы, Прапойскага раёна, тав. Дзяткоў рэзка крытыкаваў Наркамат аховы здароўя БССР за бязрукасць у справе ўкамплектавання кадрамі сельскіх урачэбных участкаў, за лібералізм да тых урачоў, якія дэзертыруюць з работы на вёсцы.

На вячэрнім пасяджэнні выступілі таксама тт. Адамовіч (Глушанскі ўрачэбны ўчастак, Бабруйскага раёна), Лапцеў (Дзятлоўскі ўрачэбны ўчастак, Гомельскага раёна), Капанейкін (Піхініцкі ўрачэбны ўчастак, Рагачоўскага раёна), прафесар Штэрэнберг (Ленінград) і Гетманец (Дабрынскі ўрачэбны ўчастак, Ольшанскага раёна, УССР).

У канцы вячэрняга пасяджэння быў аб'яўлен загад намесніка наркома аховы здароўя СССР тав. Грашчанкова аб узнагароджанні значкамі «Отличнику здравоохранения» 42 медыцынскіх работнікаў беларускага сяла, якія паказалі ўзоры самаадданай работы па ўмацаванню сельскага ўрачэбнага ўчастка, павышэнню якасці лячэбна-прафілактычнай работы. Сярод узнагароджаных загадчык астровенскай участковай больніцы Е. А. Баднёў, загадчык глушанскай сельскай больніцы М. С. Адамовіч, фельчар лоеўскай амбулаторыі І. І. Багдановіч, загадчык горвальскай участковай больніцы М. М. Глухоўскі, акушорка кішчына-слабодскага калгаснага радзільнага дома Н. Я. Дубень і інш. Пад гром апладысментаў т. Грашчанкоў уручаў значкі ўзнагароджаным.

З вялікім уздымам з'езд прыняў тэкст прывітальнай тэлеграмы Наркому абароны, маршалу Совецкага Саюза таварышу Варашылаву.

***

19 чэрвеня ўвесь дзень прадаўжаліся спрэчкі. Тав. Куканега (Клімавіцкі раён) указаў на тое, што наркамат дрэнна кіруе медыцынскімі ўстановамі на сяле, не ведае іх жыцця, запатрабаванняў. Наркамат мала цікавіўся павышэннем кваліфікацыі сельскага медперсанала, не арганізаваў паказ і абмен вопытам лепшых спецыялістаў медыцыны рэспублікі. Тав. Куканега адзначыў дрэнную работу Магілеўскага абласнога антэкаўпраўлення ў забеспячэнні сельскіх медустаноў неабходнымі медыкаментамі.

Тав. Жаваранак (Рудзенскі раён) адзначыў, што сельскія фельчарска-акушорскія і ўрачэбныя ўчасткі дрэнна забяспечаны транспартам. Гэта затрудняе выезды за некалькі кілометраў для аказання хворым неадкладнай медыцынскай дапамогі. Наркамат мала цікавіўся гэтым пытаннем.

Тав. Курцэр (Заслаўскі раён) крытыкавала наркамат за слабае кіраўніцтва медыцынскімі ўстановамі ў пагранічных раёнах.

У спрэчках таксама выступілі тт. Мінашкін (ЦК Чырвонага Крыжа БССР), Чпеўская (Віцебскі раён), Варшаўчык (Касцюковіцкі раён), Ханін і іншыя.

У канцы вячэрняга пасяджэння 19 чэрвеня з вялікай прамовай выступіў пёпла спатканы дэлегатамі з'езда старшыня Совета Народных Камісараў БССР тав. Кісялёў.

Сёння работа з'езда прадаўжаецца.

ЗАКОНЧЫЛІ ССЯЛЕННЕ Ў КАЛГАСНЫЯ ПАСЕЛІШЧЫ

ПУХАВІЧЫ. Ажыццяўляючы рашэнні майскага Пленума ЦК ВКП(б) і чэрвеньскага Пленума ЦК КП(б)Б Пухавіцкі раён датэрмінова завяршыў ссяленне хутарскіх двароў у калгасныя паселішчы. На 17 чэрвеня сселена ў калгасныя цэнтры 750 двароў калгаснікаў і адбудавана 549. У бліжэйшыя дні заканчваецца адбудова астатніх двароў.

***

БАСЦЮКОВІЧЫ. У выніку шырокай арганізацыйна-масавай работы па ажыццяўленню гістарычнай пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР у раёне закончана ссяленне з хутарскіх участкаў у калгасныя цэнтры 297 калгаснікаў і аднаасобнікаў. У кожным калгасе на будаўніцтве дамоў працуюць спецыяльныя брыгады будаўнікоў.

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

АБ НАЗНАЧЭННІ тав. ГІНЗБУРГА С. З. НАРОДНЫМ КАМІСАРАМ ПА БУДАЎНІЦТВУ

Назначыць тав. Гінзбурга Семёна Захаравіча Народным Камісарам па будаўніцтву.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
16 чэрвеня 1939 г.

ГОРКАЎСКІЯ ВЕЧАРЫ

18 чэрвеня Зялёны тэатр менскага парка імені А. М. Горкага запоўнілі звыш 3 тысяч чалавек. Сюды на літаратурны вечар, прысвечаны светлай памяці А. М. Горкага, прышлі стахановцы прадпрыемстваў, прадстаўнікі совецкай інтэлігенцыі, байцы, камандзіры і палітработнікі менскага гарнізона.

У прэзідыуме пісьменнікі Якуб Колас, М. Лынькоў, Клімковіч, Агняцвет, Шапіра і інш. У глыбіні сцэны вылучаецца ўпрыгожаны жывымі кветкамі вялікі партрэт Алексея Максімавіча.

Вечар адкрывае сакратар Менскага гаркома КП(б)Б тав. Вінаградаў. Даклад аб жыцці і літаратурна-публіцыстычнай дзейнасці вялікага пролетарскага пісьменніка зрабіў супрацоўнік інстытута сусветнай літаратуры імені Горкага тав. Левін. З успамінамі аб Алексею Максімавічу выступілі тт. Колас, Лынькоў, Клімковіч. Паэтэсы С. Каган і Э. Агняцвет прачыталі свае вершы, прысвечаныя Горкаму.

З цікавымі ўспамінамі аб сустрэчах з Алексеем Максімавічам выступіў настаўнік рабфака тав. Посах.

У 1910 годзе тав. Посах разам з групай настаўнікаў, булучы ў замежным падарожжы, наведаў востраў Капры, дзе жыў Алексей Максімавіч. Настаўнікі папрасілі Алексея Максімавіча прыняць удзел у таварыскім вечары. Ён ахвотна згадзіўся і прышоў разам з жонкай і сынам. А. М. Горкі папрасіў настаўнікаў спець беларускія народныя песні, прачытаць вершы. Яму вельмі спадабаліся паасобныя вершы Я. Купалы і Я. Коласа. Ён прасіў прыслаць іх яму.

Па прыездзе ў Расію настаўнікі выслалі Алексею Максімавічу два зборнікі — «Жалейку» — Янкі Купалы і «Песні жальбы» — Якуба Коласа. Неўзабаве ў «Журнале для всех» паявіўся допіс А. М. Горкага, у якім ён вельмі цёпла адгукаўся аб вершах народных паэтаў.

***

Літаратурныя вечары, прысвечаныя памяці зладзейска ўмяртвлёнага трапкісцкабухарынскімі бандытамі Алексея Максімавіча Горкага, адбыліся ў Магілеве, Віцебску, Мазыры і іншых гарадах рэспублікі. (БЕЛТА).

ПАСЯДЖЭННЕ СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

13 чэрвеня адбылося пасяджэнне Совета Народных Камісараў БССР. Першым было разгледжана пытанне аб ходзе выканання плана мяса- і малакапаставак 1939 года. У прынятай пастанове Соўнарком адзначыў, што, не гледзячы на рад указанняў і катэгарычных напамінанняў, поўгадовае задание па мясапастаўках выканана па рэспубліцы на 1 чэрвеня на 83,8 проц., гадавы план малакапаставак — на 26,1 проц.

Асабліва дрэнна выконваюцца планы паставак па Гомельскай, Менскай і Магілеўскай абласцях (па мясу ад 78 да 85 проц., па малаку — 24—29 проц.).

Раённыя совецкія і загатоўчыя арганізацыі ліберальна адносяцца да невыконваючых планаў паставак калгаснікаў і аднаасобнікаў. Па Быхаўскаму раёну план абавязковых паставак выканан толькі на 41,7 проц., з іх аднаасобны сектар — на 10 проц. Калгасы імені Чапаева, «XVII Кастрычнік», «Стойкі» сістэматычна не выконваюць абавязковых паставак, але раённыя арганізацыі не прымаюць ніякіх мер да зрыўшчыкаў. Па Самахвалавіцкаму раёну ў першым квартале гэтага года не прымалі ўдзелу ў пастаўках мяса 3392 гаспадаркі калгаснікаў і 535 гаспадарак аднаасобнікаў. Загатоўчыя арганізацыі (Белзагатжывёла, Белмаслапром) прадаўжаюць нарушаць устаноўленыя законам правілы прыёмкі, учоту і ацэнкі якасці прадукцыі, паступаючай па абавязковых пастаўках. Паранейшаму ў радзе раёнаў маюць месца факты самавольнага залічэння работнікамі загатоўчых арганізацый у дзяржзакупкі малака і ёўны, пастаўленых здатчыкамі ў лік выканання планаў абавязковых паставак.

Старшыні оргкамітэтаў і райвыканкомаў не аказваюць належнай практычнай дапамогі загатоўчым арганізацыям і не ўстанавілі сістэматычнага кантролю за іх работай.

Соўнарком прызнаў работу сістэмы Упаўнаркамзага нездавальняючай і прапанаваў прыняць рашучыя меры да тых райупаўкамзагаў, якія не выконваюць заданняў партыі і ўрада.

За непрыняцце мер па спагнанню нядоімак па мясапастаўках, за праяўленні лібералізм да калгаснікаў і асабліва аднаасобнікаў, не выконваючых сваіх абавязкаў перад дзяржавай, Упаўнаркамзагу па Смалявіцкаму раёну т. Буцько абвешчана суровая вымова з папярэджаннем.

Абвешчана вымова т. Маршаку за нездавальняючую работу Белмаслапрома. Пастаноўлена прасіць Камісію Совецкага Кантроля праверыць работу ўсёй сістэмы Белмаслапрома.

У першых чыслах ліпеня заслухаць на пасяджэнні Соўнаркома спецыяльны даклад аб выкананні мяса- і малакапаставак.

На пасяджэнні быў заслухан даклад аб праведзенай рэвізіі Наркамфінам Саюза работы фінансавых органаў і асобных наркаматаў БССР.

Соўнарком прызнаў работу Наркамфіна БССР па выкананню фінансавага плана, асабліва па сельскіх плацяжах, нездавальняючай. Звернута ўвага на адставанне спагнання падаткаў і збораў з аднаасобнікаў. Да 1 чэрвеня запазычанасць па сельскіх плацяжах складае 19 млн., з іх — 14 млн. з аднаасобнікаў. Асабліва адстае Магілеўская вобласць (загадчык аблфа т. Казлоў). План па падатках і збору тут выканан на 66,5 пропанта.

Праверкай выканання рашэнняў Соўнаркома па выніках рэвізіі Наркаммясцпрома, Наркамгаса і Наркамзема ўстаноўлена, што гэтыя наркаматы не выправілі сваіх ранейшых недахопаў і дапусцілі рад новых нарушэнняў.

Па Наркамату мясцовай прамысловасці план па валавой прадукцыі выканан, але не забяспечана работа ў галіне ўзмацнення барацьбы за гаспадарчы разлік і зніжэнне сабекошту. У выніку ў першым квартале перавыдатак па сабекошту складае 1.346 тыс. рублёў, звышпланавыя страты складаюць 1.820 тыс. рублёў, план накаплення недавыканан на 2,5 млн. рублёў, з прычыны чаго недадана ў бюджэт 1.117 тыс.

Наркаммясцпром дапусціў агульнае прэміраванне работнікаў наркамата і трэстаў нават тых прадпрыемстваў, якія не выканалі сваіх планаў па якасных паказальніках. Па цагельнаму трэсту страты складаюць 1.060 тыс. рублёў, а кіраўнік трэста тав. Арлоў прэміраван наркаматам 1.000 руб. Такой-жа сумай прэміраван кіраўнік Булкерамтрэста т. Кляшторны, у той час як за першы квартал страты складаюць 750 тыс. рублёў.

Аналагічныя нарушэнні маюць месца і па Наркамзему і па Наркамгасу.

Соўнарком прапанаваў Наркамфіну БССР і старшыням оргкамітэтаў забяспечыць да пачатку падатковай кампаніі 1939 года поўнае спагнанне ўсіх нядоімак па падатках і зборах з насельніцтва.

Наркаматам прапанавана зніжаючыяся недахопы і забяспечыць іх ту ў адпаведнасці з рашэннямі з'езда партыі.

Заслухаўшы даклад аб транспартаванні малых рэк рэспублікі, ком зацвердзіў прадстаўлены планпя рэк — Друць, Ольса, Іпуць асігнаваў на гэтую мэту 495 тыс.

На гэтым-жа пасяджэнні за праект планіроўкі горада Менска (Б

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ОРГІНСТРУКТАРСКІ АДДЗЕЛ АБКОМА ПАРТЫІ

У сваім дакладзе на XVIII з'ездзе ВКП(б) таварыш Сталін, гаворачы аб задачах далейшага ўмацавання партыі, указаў на неабходнасць: «Наблізіць кіруючыя органы да пізавой работы з тым, каб зрабіць іх кіруючую работу ўсё больш аператыўнай і канкрэтнай, усё менш засядацельскай і канцылярскай».

Пастаўленыя задачы XVIII з'ездам ВКП(б) патрабуюць ад кіруючых партыйных органаў шырокага разгортвання партыйнай работы і паляпшэння аператыўнага кіраўніцтва ўсімі яе звеннямі.

Оргінструктарскі аддзел Віцебскага абкома КП(б)Б пасля з'езда перабудоўвае сваю работу. Перш за ўсё арганізавана планавасць правядзімых мерапрыемстваў. У плане мы намецілі заняцца вывучэннем такіх пытанняў, як кіраўніцтва ростам партыі, выхаванне партарганізацыямі беспартыйнага актыва, падрыхтоўка пытанняў да пасяджэнняў бюро райкомаў, ажыццяўленне партарганізацыямі кантролю над гаспадарчай дзейнасцю адміністрацыі, пастаноўка партыйнай інфармацыі і т. д.

У рэзультаце кожны інструктар загадзя ведае, чым ён павінен займацца. Гэта дала магчымасць накіраваць дзейнасць оргінструктарскага апарата на рашаючыя ўчасткі. Калі раней інструктары займаліся выключна разборам заяў і апеляцый, то зараз кожны з іх рыхтуе рад іншых пытанняў, звязаных з партыйным жыццём. Так, напрыклад, інструктар тав. Цэйтліна нядаўна праверыла стан ўчоту і афармлення партыйных дакументаў у Аршанскай раённай партарганізацыі, дзе выявіла нарушэнне інструкцыі ЦК ВКП(б) аб партыйным учоце. Інструктар т. Садчук праверыў выкананне рашэнняў абкома Расонскім райкомам партыі, а т. Іваноў праверыў, як Лепельскі райком партыі выконвае рашэнні адчотнай партыйнай канферэнцыі.

Часта мы склікаем нарады інструктараў, абмяркоўваем пытанні, якія рыхтуе аддзел на бюро абкома. Да разбору асобных заяў і апеляцый, паступаючых у аддзел, прыцягваем членаў пленума гаркома, абкома і кіруючы партыйны актыў.

Выконваючы рашэнні XVIII з'езда партыі, наш аддзел аказвае дапамогу інструктарскаму апарату гаркома і райкомаў.

За апошні час узмацніў сваю работу оргінструктарскі аддзел Віцебскага гаркома. Ім была праведзена нарада сакратароў первічных партарганізацый і сакратароў партбюро навучальных устаноў аб падрыхтоўцы партыйных сходаў і характару вынасімых партыйных рашэнняў. Аб лепшым вопыце падрыхтоўкі партыйных сходаў расказалі сакратары партбюро тт. Беленькая (Політэхнікум), Мальцаў (Ветзааінстытут) і інш. Многія таварышы крытыкавалі сакратара первічнай партарганізацыі фельчарска-акушорскай школы, дзе дрэнна рыхтуюцца партыйныя сходы, дзе да пачатку схода комуністы не ведаюць парадку дня.

Для азнаямлення з работай інструктараў райкомаў, апрача пасылкі сваіх работнікаў на месцы, мы часта выклікаем асобных таварышаў у абком, гутарым з кожным паасобку. З гутарак выясняецца, што многія райкомы партыі няўважліва адносяцца да інструктараў, не аказваюць ім дапамогі. Інструктар Дубровенскага райкома партыі тав. Абатановіч скарэзіўся, што сакратар райкома ніколі не пытае ў яго аб праведзенай рабоце ў первічных партарганізацыях.

Адным са слабых месц многіх інструктараў райкомаў з'яўляецца адсутнасць плана іх работы. Нярэдка бывае таж, што яны не ведаюць загадзя чым канкрэтна займацца, якія пытанні рыхтаваць да пасяджэння бюро райкома. А адсутнасць планавасці ў рабоце інструктара сказываецца і на рабоце первічнай партарганізацыі, да якой прымацаван інструктар.

Нядаўна намі быў разгледжан план работы Чарэйскай первічнай партарганізацыі Чашніцкага раёна, які быў складзен пры дапамозе інструктара. У гэтым плане няправільна былі прадугледжаны абвязкі комуністаў па выкананню намечаных мерапрыемстваў. Напрыклад, сход брыгадзіраў і звенняўых калгаса намечана правесці комуністу т. Яцуку, а адказны за скліканне — старшыня сельсовета т. Вескер. Сход агітатараў намечана правесці т. Яцуку, а адказны за скліканне — таксама т. Вескер і т. д. Такім чынам роль комуніста т. Вескера зведзена да забеспячэння яўкі на сходы.

Згодна гэтага плана нічога не даручаецца астатнім комуністам. Безумоўна, што такая практыка не дае магчымасці таварышам накапляць вопыт партыйнай работы, перашкаджае іх ідэйнаму росту.

У практыцы работы райкомаў нарады сакратароў первічных партарганізацый праводзяцца агульна, у разрэзе раёна ці горада, а не па асобных галінах працы, якімі непасрэдна займаюцца інструктары райкомаў. Гэта перашкаджае глыбокаму вывучэнню вопыту і перадачы яго ўсім партыйным кіраўнікам.

Оргінструктарскі аддзел абкома ўсю сваю работу накіроўвае на тое, каб узняць ролю і актыўнасць первічных партарганізацый, узняць іх большэвіцкую боездольнасць на выкананне гістарычных рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б).

І. А. КІСЛІК,
загадчык оргінструктарскім аддзелам Віцебскага абкома КП(б)Б.

Заняткі гуртка па вывучэнню «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» на менскім металазаводзе імені Чкалава.
Фото І. С. Шышко (Фотахроніка БЕЛТА).

АРГАНІЗАТАР САМАСТОЙНАГА ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ ВКП(б)

У сакавіку гэтага года партыйная арганізацыя Менскай аўтарамонтнай станцыі сабрала нараду ўсіх таварышоў, якія пасля пастановы ЦК ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выхадам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» пачалі самастойна вывучаць гісторыю партыі. На нарадзе выяснілася, што з вывучэннем гісторыі партыі абстаіць не зусім добра. Аказалася, што большасць таварышоў яшчэ нават не прыступілі да чыткі «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», а некаторыя чыталі падручнік недастаткова сур'ёзна.

Такое становішча атрымалася таму, што да гэтага часу кіраўнік партарганізацыі — т. Шыф займаў пазіцыю пасіўнага назіральніка. Раз людзі самастойна вывучаюць, думаў ён, дык чаго нам турбавацца.

— Чытаеш Кароткі курс?

— А як-жа, чытаю.

Такія пытанні і адказы часта можна было пачуць на партыйных сходах, пасяджэннях парткома ці ў таварыскіх гутарках паміж сакратаром первічнай партарганізацыі і таварышамі, якія лічыліся «вывучаючымі».

Змянілася становішча карэнным чынам пасля нарады. Пачалі з таго, што арганізавалі месца для вучобы. Абсталявалі чырвоны куток, папоўнілі бібліятэку палітычнай літаратурай. Для таго, каб людзі зразумелі, як трэба прапаваць над навуковай кнігай і, у прыватнасці, над «Кароткім курсам», па ініцыятыве тав. Шыфа, правялі кансультацыю на тэму «Як працаваць над кнігай і складаць канспект». Сур'ёзна ўзяліся члены партыі, беспартыйныя, совецкая інтэлігенцыя за вывучэнне марксізма-ленінізма. Асабліва ўпорна і настойліва працуюць над сабой тт. Нехай — інжынер-эканаміст, Белякоўскі — тэхнік па аўтасправе і іншыя.

Цяпер сістэматычна праводзяцца групавыя кансультацыі па асобных раздзелах падручніка. Праведзены ўжо тры кансультацыі па першых трох раздзелах. Звычайна 17—18 чалавек з 22 вывучаючых гісторыю партыі пасля вывучэння раздзела збіраюцца разам з кансультантам тав. Немцам на групавую кансультацыю. Па сутнасці гэта гутарка, дыскусія па найбольш важных, вузлавых пытаннях дапага раздзела. Тут людзі абменьваюцца думкамі, выясняюць незразумелыя пытанні, што ўзнікаюць у ходзе вывучэння раздзела. На апошняй кансультацыі, па III раздзелу, кансультанту было задана каля 12 пытанняў.

Сакратар партарганізацыі сістэматычна азнаямляецца з ходам вывучэння гісторыі партыі асобнымі таварышамі: як хто займаецца, якія ён сустракае цяжкасці ў сваёй вучобе, як ён разумее тое ці іншае палажэнне, пытанне дапага раздзела. Гэта дасягнута не шляхам экзаменаў члена партыі або беспартыйнага, а шляхам таварыскіх гутарак з кожным паасобку.

Тав. Шыф — малады партыйны работнік. Зараз ён вылучан майстрам пэха. Паспяхова спалучаючы гаспадарчую і палітычную работу, ён сістэматычна і ўпорна вывучае гісторыю партыі. Паспяхова авалодвае большэвізмам. Ён, як і многія іншыя, зараз закончыў вывучэнне першых трох раздзелаў «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Зараз таварышы прыступаюць да вывучэння IV раздзела. Правільна зрабіла партарганізацыя, што рашыла арганізаваць на месцы спецыяльную лекцыю — як вывучаць дыялектычны і гістарычны матэрыялізм.

Кіраўнік партарганізацыі тав. Шыф не толькі сам вучыцца, а пастаянна дапамагае вывучаць гісторыю партыі тт. Нагату — майстру мантажнага цэха, і Васковіччу — шоферу, якія адчуваюць патрэбу ў дапамозе. Гэтыя таварышы жадалі вучыцца ў гуртку. Але з-за двух таварышоў нямэтазгодна было ўтвараць спецыяльны гурток. Тав. Шыф рашыў сістэматычна дапамагаць ім вывучаць падручнік, аб'ясняць незразумелыя пытанні. Гэта дало магчымасць таварышам не адставаць ад большасці самастойна вывучаючых гісторыю партыі. Тав. Нагат спачатку не ведаў як трэба складаць канспект. Калі аб гэтым даведаўся тав. Шыф, ён разам з ім пачаў чытаць раздзел падручніка і тут-жа на месцы канспектаваць. Зараз тав. Нагат самастойна канспектуе матэрыял.

Зробленае партыйнай арганізацыяй аўтарамонтнай станцыі ў справе арганізацыі глыбокага і сістэматычнага вывучэння гісторыі партыі — толькі першыя крокі. Партыйная арганізацыя і яе кіраўнік павінны дабіваццa яшчэ большых поспехаў у вывучэнні комуністамі, комсамольцамі і совецкай інтэлігенцыяй гісторыі партыі.

З. МЯЦЕЛІЦА.

НАШ ВОПЫТ ПАЛІТМАСАВАЙ РАБОТЫ

Камарынскі райком КП(б)Б і первічныя партарганізацыі праводзяць рад канкрэтных мерапрыемстваў у галіне агітацыйнай, палітмасавай работы па раз'ясненню працоўным вялікіх задач, пастаўленых перад намі XVIII з'ездам партыі. Шырока скарыстоўваецца выдатны вопыт палітмасавай работы, набыты партарганізацыяй у часе выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

26 чысла кожнага месяца РК КП(б)Б праводзіць ва ўсіх первічных партарганізацыях дзень агітатара. У гэты дзень у кожным агіткалектыве (а іх у нас 15) праводзяцца семінары, а ў іншых первічных партарганізацыях — нарады агітатараў па абмену вопытам работы.

Зараз у калгасах, на прадпрыемствах і ва ўстановах раёна працуе 228 палітгурткоў па вывучэнню матэрыялаў XVIII з'езда ВКП(б) і Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР. У гэтых гуртках навучаецца больш 6 тысяч чалавек. У кожнай установе раёна раніцою, да пачатку работы, праводзяцца палітінфармацыі.

— У нашым калгасе працуе 6 гурткоў, — расказвае агітатар тав. Езянок Пётр Ісакавіч, — старшыня калгаса імені Будзённага, Радзінскага сельсовета. Яны ахапляюць каля 140 калгаснікаў. У гэтых гуртках калгаснікі вывучалі даклады таварыша Сталіна і тт. Молатава і Жданава на XVIII з'ездзе ВКП(б), а таксама прамовы тт. Андрэева і Варашылава. Зараз у гуртках пачалі вывучаць рашэнні Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР. Агітатары арганізавалі таксама чытку газет на полі. У брыгадах і звеннях праводзіцца шырокае раз'яснение калгаснікам гістарычнага рашэння ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання».

Асаблівую павагу заваявалі сабе ў калгаснікаў агітатары нашага калгаса тт. Дзянісенка — настаўнік, Рэбко — брыгадзір, Самойленка — калгаснік. У гуртках тт. Дзянісенка і Рэбко заняткі праходзяць цікава і жыва. Яны дапамагаюць рэдкалегіям у выпуску насценгазет і паказваюць прыклады на сваіх участках работы.

Правільная пастаноўка агітацыйнай работы сярод калгаснікаў дапамагла наладзіць працоўную дысцыпліну, своечасова і высокаякасна закончыць веснавую сяўбу, дапамагае ўзорна правесці прапалачную і падрыхтавацца да ўборачнай.

Большэвіцкія ўзоры правядзення агітацыйнай работы паказваюць агітатары тт. Жаранаў — дырэктар Асарэвіцкай НСШ, Пахарэнка — настаўнік, Пугач — звеньевы калгаса «Чырвоны араты», Камкоў, Цітава і Быхаўскі — настаўнікі Крукаўскай СШ, Гудзенак Пётр — брыгадзір калгаса «III Інтэрнацыянал» і рад іншых. Яны сістэматычна праводзяць заняткі з калгаснікамі па вывучэнню матэрыялаў XVIII з'езда партыі, чытаюць на полі, у брыгадах і звеннях газеты, раз'ясняюць калгаснікам рашэнні ВКП(б) і СНК СССР аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання і аб падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю. Агітатары тт. Жаранаў, Быхаўскі і Пугач зрабілі рад дакладаў на антырэлігійныя і міжнародныя тэмы.

У часе палітмасавай работы многія агітатары самі многаму навучыліся і палітычна вырасліі. Агітатары тт. Быхаўскі і Дзянісенка гавораць: «Калісьці мы не маглі зрабіць даклада, а цяпер навучыліся». Таварышы Быхаўскі і Дзянісенка, як лепшыя агітатары, прыняты ў рады партыі. За час вясенніх работ у партыю прынята больш 18 лепшых агітатараў і прапагандыстаў.

Колькасць агітатараў з кожным днём расце. Зараз на полі працуюць агітатарамі і чытчыкамі больш 300 чалавек.

Добра праводзяць сярод працоўных палітмасавую работу Крукоўская, Абарэвіцкая, Піркаўская первічныя партарганізацыі, Радзінская, Барпічэўская кандыдацкія групы. Тут у калгасах сістэматычна працуюць палітгурткі, праводзяцца даклады на антырэлігійныя і міжнародныя тэмы. Добра працуюць агіткалектывы і чытчыкі на полі, у брыгадах, у звеннях, арганізавана палітасветработа ў дамах соцкультуры.

Вялікае значэнне ў падняцці палітмасавай работы ў калгасах і на прадпрыемствах маюць палітдні. Мы пачалі праводзіць іх пасля XVIII з'езда партыі. Наша раённая партарганізацыя за гэты час правяла ўжо чатыры палітдні па раз'ясненню рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б), па міжнароднаму становішчу і аб Дні друку. У гэтым месяцы праведзен палітдзень па раз'ясненню пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання». Гэтымі палітднямі ахоплена больш 16 тысяч насельніцтва.

Пасля кожнага палітдня мы праводзім нараду, дзе абмяркоўваем узнятыя калгаснікамі пытанні і меры па знішчэнню выяўленых недахопаў. Так, пасля праведзенага палітдня аб Дні друку выяснілася слабая пастаноўка работы насценгазет у калгасах. Гэтае пытанне было абмеркавана РК КП(б)Б і намечаны мерапрыемствы па паляпшэнню работы насценгазет. У выніку перавыбраны ўжо 13 рэдкалегій, пачасціўся выпуск насценгазет у брыгадах. У часе палітдня на тэму аб міжнародным становішчы рад калгаснікаў крытыкаваў слабую работу арганізацый Асоавіяхіма і МОПР. На гэтыя сігналы райком КП(б)Б таксама рэагаваў.

Ёсць у нас, аднак, первічныя партарганізацыі, дзе палітмасавая работа сярод працоўных як належыць яшчэ не разгорнута. Да такіх адносяцца партарганізацыі Сяпанаўскага, Верхне-Жараўскага і Ніжне-Жараўскага сельсоветаў. Тут агіткалектывы працуюць слаба, парторгі іх работу не ўзначальваюць. Зусім відавочна, што Камарынскаму райкому КП(б)Б трэба яшчэ многа чаго зрабіць, каб дабіцца большэвіцкага размаху палітмасавай, агітацыйнай работы ва ўсіх первічных партарганізацыях.

Прадстаячыя выбары ў мясцовыя советы дэпутатаў працоўных ускладаюць на раённыя партыйныя арганізацыі абавязак яшчэ шырэй разгарнуць палітмасавую работу, каб выбары сустрэць выдатнымі вытворчымі дасягненнямі і правесці іх па-большэвіцку.

І. ШАТРУКОЎ,
загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Камарынскага РК КП(б)Б.

ЗА ЧЭСЦЬ ФАБРЫЧНАЙ МАРКІ

КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА ЯКАСЦІ

Менская галантарэйная фабрыка імені Фрунзе дасягнула не дрэнных поспехаў у социялістычным спаборніцтве імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. Спачатку года прадпрыемства роўнамерна з дня ў дзень, з месяца ў месяц перавыконвае сваю вытворчую праграму. 14 чэрвеня мы на 45 дзён раней тэрміна закончылі 7-месячны план, даўшы спажыўцу звыш плана на паўтара мільёна рублёў галантарэйных вырабаў.

У гэтым годзе фабрыка ўпершыню пачала выконваць план па сортнасці па абсалютнай большасці вырабаў. Грэбняў першага сорту выпускаем 84—90 проц. пры плане 80 проц., гузікаў першага сорту выпрацоўваем 65—70 проц. пры заданні ў 60 проц. На сённешні дзень адстае яшчэ па якасці выпускаемай прадукцыі наш галалітавы цэх (начальнік тав. Гальбург). Цэх сістэматычна не выконвае задання па сортнасці. У некаторай ступені гэта аб'ясняецца дрэннай якасцю сыравіны, якую мы атрымліваем ад Днепрапетроўскага галалітавага завода. Але справа не толькі ў гэтым. У цэху недастаткова змагаюцца за якасць выпускаемай прадукцыі. Дрэнная работа асобных работніц цэха, якія парушаюць тэхналагічны працэс і выпускаюць бракаваную прадукцыю, не абмяркоўваецца грамадскасцю. Майстры пэха тав. Нехайчык і Рэйняк недастаткова сочаць за работай, мала дапамагаюць маладым работнікам ў авалоданні сваім працэсам, міраццa з бракам.

Совецкі пакупнік прад'яўляе велізарны попыт на высокаякасныя галантарэйныя вырабы. Ён патрабуе ад нас, каб нашы гузікі, грэбні і расчоскі былі рознастайны па свайму асартыменту і прытым выдатнай якасці. Не будзем утойваць: далёка не заўсёды прадукцыя фабрыкі поўнасцю адпавядае справядлівым патрабаванням пакупнікоў.

У нас яшчэ да гэтага часу выпускаецца нямала нясортнай, бракаванай прадукцыі. У сярэднім фабрыка штомесячна выпускае на 7—8 тысяч рублёў бракаваных галалітавых грэбняў, фасованых гузікаў і іншых вырабаў. Асобныя работніцы ў пагоні за колькасцю забываюць аб якасці выпускаемай імі прадукцыі. Мойшчыца цэлулоіднага цэха тав. Эпельман, напрыклад, дрэнна прамывае пасля шліфоўкі грэбні. У рэзультаце паміж зуб'ямі грэбняў астаецца многа грязі. Неахайна таксама адносіцца да выканання сваёй аперацыі паліроўшчыца тав. Касцюк.

Мы павінны павесці рашучую барацьбу з бракаробамі, якія ганьбяць марку нашага прадпрыемства. Неабходна палепшыць міжпрацэсавы кантроль, узмацніць бракераж, які пастаўлен у нас нездавальняюча.

Пераважная большасць работніц нашага прадпрыемства гарыць жаданнем даць совецкаму спажыўцу прадукцыю самай высокай якасці. Нашы лепшыя стаханаўцы-паліроўшчыцы тт. Мархель, Капусціна, свярлільшчыца тав. Врублеўская, фрэзероўшчыцы тт. Чыркун і Адамцэвіч, дубляр тав. Коўшык і многія іншыя з'яўляюцца выдатнікамі якасці.

Зараз ва ўсіх цэхах абмяркоўваецца заклік калектыва ленінградскага станка-завода імені Свердлова аб арганізацыі спаборніцтва за чэсць фабрычнай маркі. Зварот ленінградцаў актыўна падтрымліваецца і знаходзіць усеагульнае адабрэнне сярод усіх рабочых і работніц нашай фабрыкі.

У мэтах паляпшэння якасці прадукцыі мы ўжо зараз пачалі праводзіць пэлы рад мерапрыемстваў. Арганізаван папярэдні агляд і сартыроўка паступаючай сыравіны, што дасць нам магчымасць больш правільна і рацыянальна скарыстаць яе. Намечана правесці ў бліжэйшыя дні фабрычную канферэнцыю спецыяльна па пытанню аб якасці нашай прадукцыі.

Наша фабрыка мае ўсе магчымасці выпускаць галантарэйныя вырабы выключна высокай якасці.

Б. Я. РАБКІН,
дырэктар менскай галантарэйнай фабрыкі імені Фрунзе.

Справаздача і выбары профорганаў

ЗАЎКОМ, ЯКІ НЕ СПРАВІЎСЯ СА СВАІМІ ЗАДАЧАМІ

Падрыхтоўка да справаздачна-выбарчай кампаніі профорганаў на гомельскім тлумачавым камбінаце была праведзена вельмі дрэнна. Гэта быстра сказалася. На сход калектыва першай змены з'явілася ўсяго 360 членаў саюза замест 538. Заўком нават не змог забяспечыць рэгістрацыю з'явіўшыхся, і да пачатку схода 100 чалавек разышлося. Сход быў адкладзен на наступны дзень.

Са справаздачай аб рабоце заводскага камітэта выступіў старшыня заўкома тав. Арлоў. Дакладчык чамусьці зусім абышоў усе пытанні профсаюзнай работы і ў асноўным гаварыў аб гаспадарчых справах прадпрыемства. Тав. Арлоў умаўчаў аб радзе буйнейшых недахопаў у рабоце заўкома.

У спрэчках па справаздачнаму дакладу выступіў 31 чалавек. Члены саюза падвергілі рэзкай крытыцы работу заўкома.

На камбінаце да гэтага часу налічваецца звыш 200 рабочых і работніц не членаў саюза. Характэрна, што заявы рабочых кацельнай тт. Расодава і Ермакова аб прыёме іх у члены саюза праляжалі ў профорга т. Грыдасава больш трох месяцаў.

Заўком не ўзначаліў социялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. Заключаныя паміж асобнымі рабочымі, брыгадамі, пэхамі дагаворы ні разу не правяраліся.

Вопыт лепшых профактывістаў — стаханаўцаў не перадаваўся астатнім рабочым. Сродкі, прызначаныя на вучобу профактыва (4.000 рублёў), не скарыстаны.

На працягу двух месяцаў дошка пачоту камбіната пустуе. Між тым на прадпрыемстве ёсць нямала выдатных стаханаўцаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў, як, напрыклад, тт. Лаўрова, Ерохаў, Лебедзева і іншыя, якія заслужылі быць адзначанымі на дошцы пачоту. Але заўком гэтым не пікавіцца.

На камбінаце вялікая пякучасць рабочай сілы. Толькі з аднаго мылаваранага завода за апошнія чатыры месяцы ўшло 40 чалавек. Маладыя рабочыя, якія нядаўна прышлі на вытворчасць, не акружаны належнымі клопатамі і ўвагай.

Работніца тарнага склада тав. Шакула ў сваім выступленні сказала, што яна не раз звярталася ў заводскі камітэт з просьбай аказаць ёй дапамогу ў ліквідацыі непісьменнасці, але ніякага адказу яна ад работнікаў заўкома не атрымала.

Вельмі слаба пастаўлена была культурна-масавая работа. За апошні год на прадпрыемстве змяніліся тры культработнікі. У чырвоным кутку заўсёды брудна, апрача більярда тут нічога няма. Работа грамадскіх арганізацый (Асоавіяхім, МОПР, Чырвоны крыж) пастаўлена нездавальняюча.

Многія выступіўшыя рабочыя ўнеслі рад канкрэтных прапаноў для далейшага паляпшэння ўсёй профсаюзнай работы на камбінаце.

У спісак для тайнага галасавання ўключаны лепшыя людзі прадпрыемства, перадавікі вытворчасці тт. Коласава, Сіроцін, Гладкі, Гуянава, Ліўшыц і інш.

Ф. КРЫМСКІ.

Жыццё Чырвонай Арміі

ПІСЬМЫ ПАТРЫЁТАЎ

Адзіным жыццём жыве Чырвоная Армія са сваім многанацыянальным совецкім народам. Бацькі, пасылаючыя сыноў у рады Чырвонай Арміі, завязваюць дружаскую перапіску з камандваннем часці. Праз пісьмы яны цікавяцца, як авалодваюць іх дзеці баявой і палітычнай вучобай, як выконваюць бацькоўскі наказ: служыць часна і берагчы, як зяніцу вока, социялістычную радзіму. Гэтыя пісьмы нярэдка зачытваюцца байцам на палітінфармацыях. Пішуць пісьмы бацькам байцоў і камандзіры, у якіх падрабязна расказваюць аб поспехах чырвонаармейцаў.

Чырвонаармеец Іван Паўлаў за зіму дабіўся выдатнага паказальнікаў у вучобе. Па рашэнню камандавання ён удастоен высокай узнагароды: сфатаграфіраван пад разгорнутым баявым сцягам.

Аб гэтых поспехах камандзір падраздзялення т. Ермалаеў і палітрук т. Іосіфаў паведамілі мацеры байца — калгаснікі Анне Гаўрылаўне Паўлавай, якая ў адказ прыслала наступнае пісьмо:

«Гарджуся сваім сынам і жадаю яму надалей быць адданым да канца сваёй радзіме, быць такім, якім ён з'яўляецца зараз. Жадаю вам усяго добрага ў справе выхавання чырвонаармейцаў, а свайму сыну — не ўступаць пярэшынства ў социялістычным спаборніцтве і быць бязлітасным да ворага, калі ён наімкнецца пасягнуць на нашу свяшчэнную зямлю. З прывітаннем — маці чырвонаармейца А. Г. Паўлава».

Юсуф Малахан у падраздзяленні т. Ермалаева карыстаецца славай ліхога джыгіта. Яго конь «Ігарка» — самы чысты, самы абучаны. Юсуф добра страляе, нядрэнна паспявае па іншых дысцыплінах.

У адным з аулаў гарыстага Карачая жывуць яго маці Датаева Хасанаўна і браты — Ільяс і Мусоа, табуншчыкі калгаса. Яны цікавяцца, як служыць Юсуф.

Камандзір падраздзялення тав. Ермалаеў напісаў ім аб поспехах Юсуфа і падзякаваў маці за тое, што яна выхавала добрага сына. У адказ на пісьмо Датаева Хасанаўна піша: «Я вельмі і вельмі рада, што мой сын Юсуф носіць званне чырвонаармейца. Яшчэ больш радуюся таму, што ён з'яўляецца выдатнікам баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Я ўпэўнена, што ў будучых баях з фашызмам мой сын будзе героем».

У падраздзяленні т. Сазонава служаць браты Ахмет і Магір Балатаковы. Яны нікому не ўступаюць ў джыгітоўцы; на рубцы пад іх вострымі клінкамі лаза адскаквае, як пад ножніцамі вопытнага садоўніка. Ахмет і Магір свята выконваюць наказ бацькоў — калгаснікаў квітнеючай Кабардзіна-Балкарыі.

Аб сваіх поспехах яны напісалі родным. Але там узнікла сумненне, і бацькі рашылі паслаць для праверкі трэцяга брата — Ота.

Пачаўшы свой шлях у патножжа Эльбруса, Ота перасек палавіну Каўказа, пладародныя стэпы Кубані і Дона, сонечную Украіну і Беларусь. У падраздзяленні яго сустрэлі радушна і ветліва. Браты на практыцы паказалі свае дасягненні. Ота астаўся задаволеным.

— Будзьце заўсёды ўпераздзе, не ўпускайце пярэшынства — сказаў на развітанне Ота сваім братам.

Кроўнымі узамі звязана са сваім народам Чырвоная Армія, яго любімае дзецішча, яго ўзброены перадавы атрад. Калі-ж неразумныя, нагныя захватчыкі паспрабуюць пераступіць совецкія граніцы — нашай арміяй будзе ўвесь 170-мільённы совецкі народ. Такую армію не зможа зламіць ніякая сіла.

ПЁТР ФАМЕНКА,
АЛЯКСАНДР ШЭСТАК.
Н-ская часць БАВА.

ЗА ПАЛЯПШЭННЕ ЯКАСЦІ МЕДЫЦЫНСКАЙ ДАПАМОГІ НА СЯЛЕ

Да Кастрычніцкай рэволюцыі ў Беларусі медыцынскую дапамогу атрымлівала толькі прывілеяванае насельніцтва. Рабочыя-ж і сяляне-беднякі не маглі і марыць аб якой-небудзь медыцынскай дапамозе. У 1911 годзе на тэрыторыі нашага цяперашняга Дзержынскага раёна была пабудавана першая земская больніца на 10 коек, дзе працавалі адзін урач і чатыры фельчары. Яна абслугоўвала чатыры воласці: Рубяжэвіцкую, Станькаўскую, Самахвалавіцкую і Койданаўскую. Гэтая тэрыторыя ў два разы больш сучаснага раёна.

Зараз у адным Дзержынскім раёне ёсць тры больніцы (з наяўнасцю 110 коек), 7 сельскіх урачэбных участкаў, чатыры радзільныя дамы, 7 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, раённая паліклініка, 2 аптэкі, зубапратэзная майстэрня, дзіцячая кансультацыя, лабараторыя клінічных аналізаў, рэнтгенаўскі кабінет, санітарная станцыя. Медработнікаў у іх працуе 197 чалавек. Які цудоўны кантраст!

Дзержынская больніца на 90 коек мае аддзяленні: тэрапеўтычнае, хірургічнае, радзільнае і інфекцыйнае. Яна трымае жывую сувязь з усімі медустановамі перыферыі па пытаннях лячэбных, прафілактыкі, дае кансультацыі.

Па раёну ўстаноўлен адзіны прафілактычны дзень. Адзін раз у тыдзень медработнікі Дзержынска выязджаюць у калгасы праводзіць санітарна-асветную, культурна-масавую і прапісэпідэмічную работу. У клубах, сельсоветах, школах чытаюцца лекцыі. Па ўсіх калгасах і брыгадах вылучаны з лепшых значкістаў ГСА грамадскія санінспектары. Яны атрымліваюць адпаведны інструктаж, забяспечваюцца аптэчкамі і з поспехам праводзяць работу на месцах. Асабліва трэба адзначыць грамадскіх санінспектароў калгаса «Барацьбіт», Путчынскага сельсовета, тав. Піхановіч і калгаса «Іскра», Байдацкага сельсовета, тав. Дубоўскую.

У час веснавой сяўбы медыцынскія работнікі аказалі вялікую практычную дапамогу калгаснаму сялянству. Былі створаны медбрыгады ў складзе ўрача — начальніка брыгады, зубурача, фельчара, фармацэўта і радыста. Кожная брыгада, маючы ў сваім распараджэнні аўтамашыну, медыкаменты, перавязачны матэрыял і бормашыну, непасрэдна ў палявым стане аказвала медыцынскую дапамогу і праводзіла санітарна-асветную работу. Насельніцтва асталося задаволеным работай медбрыгад, якія абслугоўвалі аддаленыя калгасы раёна на працягу двух тыдняў.

Прафілактычныя прышчэпкі мы пачалі ў канцы сакавіка, значна пазней іншых раёнаў. Апошняе тлумачыцца тым, што да сакавіка нашы медустановы належалі Менскаму аддзелу аховы здароўя, які кіраваў прафілактычнай і лячэбнай работай вельмі дрэнна. Не гледзячы на гэта, мы дабіліся наступнага выканання гадавога плана прафілактычных прышчэпак: па вакцынацыі брушнога тыфа процант выканання складае 61, па прышчэпках супроць дыфтэрыта — 70, супроць дызентэрыі — 84; рэвакцынацыі воспы — 92.

З вялікай цікавасцю вывучаюць медработнікі ваенную справу. Яны кіруюць гурткамі па вывучэнню санітарнай абароны на прадпрыемствах і ў калгасах. За першы квартал 1939 года выпушчана 200 значкістаў ГСА. Цяпер працуе 11 гурткоў ГСА, у якіх займаецца 315 чалавек.

Урачы, медсёстры, санітаркі ўключыліся ў социялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. Паміж больніцамі, урачэбнымі ўчасткамі і асобнымі работнікамі аховы здароўя заключаны соцдагаворы, якія сістэматычна правяраюцца. Вельмі добрыя паказальнікі работы даюць выдатнікі: урач тав. Бяляева, зубны ўрач тав. Зур, акушэрка тав. Санько, санітаркі тт. Закроўская і Быкоўская.

Нашы медыцынскія работнікі жывуць адзіным жыццём з усім совецкім народам. Яны жыва цікавяцца падзеямі, якія адбываюцца ў нашай краіне і за яе межамі. Як палкія совецкія патрыёты, яны самааддана працуюць на фронце аховы здароўя працоўных. З вялікім уздымам вывучаюць медыцынскія работнікі «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», гэтую вылатную энцыклапедыю марксізма-ленінізма. Многія самастойна працуюць над гэтым вучэбнікам. Урач Бяляева вывучае III раздзел, зубны ўрач, комсорг тав. Кантаровіч і медсястра тав. Дзідуля вывучаюць IV раздзел, зубны ўрач Ралькіна — III раздзел і інш. Пры больніцы рэгулярна працуе палітгурток, дзе вывучаюць матэрыялы XVIII з'езда ВКП(б), III Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, пытанні міжнароднага становішча.

Некалькі слоў аб недахопах, якія перашкаджаюць у рабоце сельскіх больніц і ўрачэбных пунктаў, у паляпшэнні якасці медыцынскай дапамогі на сяле. Гэтыя недахопы, на маю думку, з'яўляюцца тыповымі для ўсіх вясковых медустаноў рэспублікі.

Вялікім тормазам у рабоце з'яўляецца пясвоечасовае давядзенне каштарысаў расходаў, што прымушае працаваць усляпую. Напрыклад, Дзержынская больніца ў 1938 годзе атрымала каштарыс расходаў толькі... 22 жніўня. Негарэльская больніца ў 1938 годзе мела каштарыс расходаў на 15 коек, у гэтым годзе штат астаецца тым-жа па колькасці, а асігнаванні чамусьці вызначаны толькі на 10 коек. У гэтым, безумоўна, вінават абласны аддзел аховы здароўя.

Наркамат аховы здароўя мала ўдзяляе ўвагі ўкамплектаванню сельскіх медустаноў кадрамі, у асаблівасці сярэдняй спецыяльнасці.

У раёне няма добра абсталяванай машыны «хуткай дапамогі». Прыходзіцца ездзіць на грузавіку. Непрыемна для ўрача, а аб хворым і казаць няма чаго.

З боку менскіх клінік адсутнічае шэфства над нашымі медустановамі. Праўда, нас запрашаюць на навуковыя канферэнцыі ў Менск, куды звычайна могуць ехаць 1—2 работнікі. Значна большая карысць была-б, калі-б хоць адзін раз у месяц у раён прыязджаў спецыяліст з горада. Ён дапамог-бы нам лепш і шырэй разгарнуць практычную і навуковую работу. Гэта спрыяла-б нашаму росту.

Б. С. ГЛАДКІ,
галоўны ўрач Дзержынскай больніцы.

ПОЎНАСЦЮ АДРАМАНТАВАЦЬ УБОРАЧНЫЯ МАШЫНЫ!

* * *

У ГАРАДКУ НЕ РЫХТУЮЦЬ УБОРАЧНЫЯ МАШЫНЫ

ГАРАДОК. (Спец. кар. «Звязды»). У гэтым годзе раён апынуўся на адным з самых апошніх месц па Віцебскай вобласці ў справе арганізацыі весновой сяўбы. Даволі сказаць, што рад калгасаў Бескатаўскага сельсовета толькі 5 дзён назад закончыў пасадку бульбы.

Ніякіх апраўданняў для такога адставання ў раённага кіраўніцтва няма. Як і ва ўсіх раёнах рэспублікі, тут былі ўсе ўмовы для правядзення сяўбы ў максімальна кароткія тэрміны. Нехапала толькі большэвіцкай арганізаванасці.

Можна было думаць, што кіраўніцтва раёна ўлічыць дапушчаныя вясной памылкі і забяспечыць узорную падрыхтоўку калгасаў да ўборкі ўраджаю. Факты, аднак, гавораць не ў карысць кіраўніцтва Гарадоцкага раёна. Яно чамусьці спакойна перніць маруднасць, якую праяўляюць у МТС і большасці сельсоветаў у падрыхтоўцы да ўборкі.

Асабліва трывожнае становішча з падрыхтоўкай уборачных машын. Узброіўшыся очкаўніцрацельскімі зводкамі, загадчык раённага зямельнага аддзела тав. Яроменка сцвярджае, што з 205 жняярак, якія ёсць у раёне, адрамантаваны 102, а з 98 сенакасілак — 72.

Калі нават паверыць загадчыку райза, выходзіць, што каля палавіны машын не адрамантавана. Але варта азнаёміцца са становішчам непасрэдна ў калгасах, каб убачыць, што і гэтыя цыфры райза яўна хлуслівыя. Напрыклад, па вестках райза, у сельгасарцелі «Новае жыццё», Бескатаўскага сельсовета, усе жняяркі адрамантаваны; пры праверцы-ж аказалася, што да рамонту іх яшчэ не прыступілі. Жняяркі толькі сцягнуты да кузні, дзе яны валяюцца ў беспарадку. У мінулым годзе пасля ўборкі жняяркі закінулі, з іх нават не вынулі нажы і яны на працягу зімы псаваліся. Па зводцы райза, у калгасе «Пабеда», Вышэдскага сельсовета, адрамантаваны тры малатарні, на самой справе аб іх рамонце ніхто і не думаў.

Мы праверылі становішча з рамонтам у 20 калгасах раёна і выявілі, што амаль нідзе не прыступлена да рамонту ўборачных машын, інвентара, як і не прыступлена да ачысткі і дэзінсекцыі складскіх памяшканняў.

Такое-ж становішча ў машынна-трактарных станцыях раёна.

Другая Гарадоцкая МТС не прыступіла да рамонту малатарань. Дырэктар МТС тав. Смарговіч гаворыць: «Днямі пачнем рамонт».

У Першай Гарадоцкай МТС ёсць 17 трактарных малатарань і ні адна з іх не адрамантавана. Прычым выклікаюць абурэнне адносіны дырэкцыі МТС да захавання каштоўнейшых машын. Пасля мінулагодняй малацьбы пакінулі малатарні ў самым безгаспадарчым стане. Не паклапаціліся нават ачысціць рашоты ад зярна і мякіны. Зярно прарасло, і рашоты зараз напамінаюць сабой велізарны дзёран з травой. 9 малатарань яшчэ і зараз не дастаўлены з калгасаў для рамонту. Дырэктар МТС т. Сямёнаў роўнадушна праходзіць міма фактаў псавання ўборачных машын.

Дырэктары МТС гатовы ўсю віну за зрыў рамонту перакласці на калгасы: «Нехапае ў нас рабочых для рамонту. Калгасы не прысылаюць машыністаў малатарань». У сапраўднасці-ж МТС мала што зрабілі, каб зацікавіць і замацаваць людзей на рамонце.

К. ПЫРХ.

* * *

ВЫКОНВАЕМ ПАСТАНОВУ ЦК ВКП(б) І СНК СССР

У нашым калгасе — 57 гаспадарак. Усе яны былі раскіданы на хутарах. Колькі шкоды наносілі калгасу хутарскія сядзібы. Яны перашкаджалі арганізацыі працы, тармазілі гаспадарчае ўмацаванне калгаса. А колькі было патраў грамадскіх пасеваў! За ўсім нельга было дагледзець.

У 1937 годзе мы прыступілі да ссялення калгаснікаў у адзінае калгаснае паселішча. Спачатку работы ішлі марудна. У першы год ссялілі ўсяго 4 двары, затое ў 1938 годзе перавезлі 14 гаспадарак.

Сёлета ў адказ на пастанову партыі і ўрада «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання» мы рашылі пакончыць з хутарамі. Да 18 чэрвеня ссялілі 17 двароў калгаснікаў, а да 10 ліпеня абавязваемся ссяліць і адбудаваць яшчэ 8. Астатніх 10 калгаснікаў сселім восенню.

Раней калгас ледзь спраўляўся з праполкай і ўборкай ураджаю. Заўсёды брыгадзіры скардзіліся, што нехапае рабочай сілы. А цяпер наш калгас з поспехам выконвае гэтыя работы. Апрача таго 8 калгаснікаў адпусцілі на работу ў нашу соцыялістычную прамысловасць.

Непазнавальным стала наша жыццё. Да рэволюцыі большасць людзей былі неграмотнымі. А цяпер усе дзеці калгаснікаў навучаюцца ў сярэдняй школе. З нашага калгаса вышаў інжынер, урач, 9 настаўнікаў, тэхнік, ветфельчар, 2 шоферы, 4 трактарысты і 2 камандзіры Чырвонай Арміі.

Гэта толькі з нашага калгаса. А колькі з калгасаў нашага сельсовета, раёна і рэспублікі! Усё гэта дала нам, калгаснікам, комуністычная партыя і наш любімы бацька таварыш Сталін.

У адказ на бацькоўскія клопаты будзем па-баявому, не шкадуючы сваіх сіл, выконваць мудрыя ўказанні партыі і таварыша Сталіна, каб зрабіць наша жыццё яшчэ больш заможным і раласным.

Емельян Цярэнцьевіч СТАСЕЛЬКА,
старшыня калгаса «Новы свет», Навасёлкаўскага сельсовета, Багушэўскага раёна.

СТРОГА АХОЎВАЦЬ КАЛГАСНЫЯ ЗЕМЛІ АД РАЗБАЗАРВАННЯ

Пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання» паклала канец наяўнасці сур'ёзных скажэнняў палітыкі партыі ў галіне калгаснага землекарыстання.

Зараз-жа пасля з'яўлення гэтай пастановы ў друку, яна была распрацавана сярод калгаснікаў нашага сельсовета. Чесныя труженікі соцыялістычнай сельскай гаспадаркі аднадушна адабраюць рашэнні ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб неабходнасці «неадкладнай ліквідацыі разбазарвання і раскрадвання калгасных грамадскіх зямель, прывядзення размераў прысядзібных участкаў да статутных норм, устанаўлення стражэйшага кантролю за недатыкальнасцю грамадскіх зямель калгасаў, рашучага абурэння рвацкіх і спекулянцкіх элементаў у калгасах».

Нядаўна па нашаму сельсовету была праведзена праверка правільнасці карыстання прысядзібнымі ўчасткамі. Праверка паказала, што некаторыя калгаснікі і аднаасобнікі захвацілі ў сваё ўласнае карыстанне ўчасткі калгаснай зямлі. У выніку прысядзібныя ўчасткі значна перавышаюць нормы, прадугледжаныя статутам сельгасарцелі. Так, напрыклад, было выяўлена, што калгаснік калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Васілій Баешка на калгаснай зямлі засеяў азімых 1,2 гектара і 0,8 гектара бульбы. Уся захвачаная гэтым калгаснікам зямля была адрэзана і перадана калгасу.

Пытанне аб захваце калгаснай зямлі абмяркоўвалася на агульных сходах калгасаў Блужскага сельсовета. На сходах аднагалосна былі прыняты рашэнні абрэзаць і вярнуць калгасам усе выяўленыя ўчасткі захвачанай калгаснай зямлі, а справу аб злосных нарушальніках статута сельскагаспадарчай арцелі неадкладна перадаць у народны суд.

Вялікую дапамогу ў забеспячэнні правільнага землекарыстання аказвае праводзімае зараз ссяленне калгаснікаў. Па ўсіх 6 калгасах сельсовета да 1 чэрвеня мелася 200 хутароў. Шляхам наладжвання інтэнсіўнай работы да 16 чэрвеня было сселена 120 двароў. У самыя бліжэйшыя дні закончым ссяленне з хутароў у калгасныя паселішчы.

А. К. ХАЛУПНЯК,
старшыня Блужскага сельсовета, Пухавіцкага раёна.

ПРЫЛІЎ АДНААСОБНІКАЎ У КАЛГАСЫ

СІРОПІНА. Пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання» выклікала прыліў аднаасобнікаў у калгасы. У калгас «Чырвоны франтавік», Лаўжанскага сельсовета, уступіла 7 аднаасобных гаспадарак. У калгас «Зара свабоды», гэтага-ж сельсовета, улілося 5 аднаасобных гаспадарак.

За апошні час ў калгасы раёна паступіла 44 заявы аднаасобнікаў з просьбай прыняць іх у калгасную сям'ю.

А. ПАЗНЯК.

Змагаюцца за высокі ўраджай ільну

ЛЕПЕЛЬ, 19 чэрвеня. (БЕЛТА). Выдатны лён расце на палях калгаса «Чырвоны сцяг», Каменскага сельсовета. У вышыню ён дасягае 70—80 сантыметраў. Увесь лён сеяўся звеннямі, на асобных участках. Усяго ў калгасе 12 ільнаводчых звеньняў.

Звеннявыя Ханяк і Кажарская з года ў год атрымліваюць высокія ўраджаі ільну. У мінулым годзе яны з гектара разрэджаных пасеваў сабралі больш чым па 7 цэнтнераў ільнасемя. Абедзве звеннявыя залічаны кандыдатамі на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку.

У гэтым годзе звенні мяркуюць сабраць яшчэ большы ўраджай. Парукай гэтаму з'яўляецца стаханаўскі догляд за пасевамі. Сяўба ільну праведзена з захаваннем усіх агратэхнічных правіл за 3 дні. Пасля сяўбы звенні ўстанавілі клапатлівы догляд за пасевамі. Як толькі лён пачаў узыходзіць, на пасевах з'явілася ільняная блошка. Для знішчэння яе было праведзена апыленне ўсходаў крэмнефторыстым натрыем з разліку 10 кілограмаў на 1 гектар.

29 мая звенні пачалі першую праполку і падкормку ільну. Адначасова з першай праполкай праведзена падкормка аміячнай селітрай. Другая праполка праведзена праз 10 дзён пасля першай. 15 чэрвеня звенні пачалі другую падкормку ільну растворам птушынага памёту. Да пачатку бутанізацыі ільну бузе праведзена трэцяя праполка. Уся работа ў звеннях праводзіцца на аснове індывідуальнай здзельшчыны. Гэта спрыяе падняццю прадукцыйнасці працы. Калгаснікі Ладзік, Ханяк, Царава, Шасцітка, Кажарская і іншыя штодзённа перавыконваюць свае нормы ў паўтара-два разы.

Разам з доглядам пасеваў калгаснікі па-стаханаўску рыхтуюцца да ўборкі. Лепшыя ўчасткі выдзелены для ўборкі ільнацерабілкамі. Машынная ўборка складзе 70 проц. усіх пасеваў. Перабленне і апрацоўку ільну кожнае звяно будзе праводзіць асобна. Для гэтага звеннямі падрыхтаваны складскія памяшканні, закончан рамонт ільнамалатарань «ЭДЗІ».

ПРЫСТУПІЛІ ДА МАСАВАГА СЕНАКАШЭННЯ

ГРЭСК. Большасць калгасаў раёна прыступілі да масавага сенакашэння. Асабліва паспяхова разгортваецца сенакашэнне ў калгасах «Пабеда» (Грэскага сельсовета) і «Баявік» (Пукаўскага сельсовета).

У калгасе «Пабеда» на 16 чэрвеня скошана 200 гектараў сенажаці. Лепшыя стаханаўцы тт. Кудзёлка і Нямковіч у тры разы перавыконваюць нормы выпрацоўкі. Яны выкошваюць па 1,52 гектара пры норме ў 0,50. Разам з касьбой праводзіцца стаганне сена.

Арганізавана праходзіць сяўба ў калгасе «Баявік». Тут ужо скошана больш 100 гектараў. Калгаснікі-стаханаўцы Іван Давыдоўскі, Мацвей Лаўруковіч і А. Давыдоўскі пры норме ў 0,50 гектара штодзённа выкошваюць па 1,28 гектара.

А. РЫМАШЭЎСКІ.

СТАХАНАЎЦЫ СЕНАЎБОРКІ

БЫХАЎ. (Кар. «Звязды»). Ва ўсю шыр разгортваецца сенаўборка ў луггасе «Вароніна». Касьба праводзіцца выключна трактарнымі і коннымі сенакасілкамі. На 13 чэрвеня скошана 127 гектараў сенажаці.

Рабочыя луггаса тт. Кірэеў, Глушкоў і Кадраў, якія працуюць на трактарных і конных сенакасілках, паказваюць узоры стаханаўскай работы. Яны кожны дзень выконваюць зменныя нормы выпрацоўкі на 150—180 проц.

Сенаўборку пачынаюць разгортваць таксама калгасы раёна. Першыя гектары сенажаці скошаны ў калгасе «Завет Ільіча», Студзянецкага сельсовета.

СОВЕЦКАЕ МАСТАЦТВА СЛУЖЫЦЬ НАРОДУ

На першай усесаюзнай канферэнцыі рэжысёраў, якая пачалася ў Маскве 13 чэрвеня і зараз прадаўжаецца, мне прышлося ў сваім выступленні закрануць адну з галоўных ідэй, якія кіруюць мною ў маёй творчай дзейнасці. Коратка кажучы, гэта цэнтральная мысль зводзіцца да таго, што для нас, совецкіх мастакоў, у совецкай краіне няма і не можа быць дзялення на такое мастацтва, якое мы робім для сябе, выражаючы свае тайныя і найглыбейшыя помыслы, і другое, знешняе, патрэбнае «на збыт», якое мы рабілі-б для публікі. Наадварот, гэты дуалізм, гэта пастаянная трагедыя буржуазнага мастака, зусім не існуе ў нас, зусім не павінна быць нам знаёма. Я бяруся сцвярджаць, што для нас няма праблемы складанага і простага мастацтва. На вопыце нашых ужо шматлікіх гастролей я пераканаўся ў тым, што няма такой самай складанай, самай глыбокай ідэі, якая не была-б успрынята найшырэйшымі масамі нашых гледачоў, калі ў аснове сваёй гэтая ідэя прагрэсіўная, ідэя вялікая, ідэя гуманістычная. Здавалася-б, шэкспіраўскі «Гамлет» прадстаўляе сабою мяжу складанасці. Над глыбокімі загадкамі гэтай трагедыі задумваліся дзесяткі мыслярэяў, аб ей напісаны сотні кніг. Як-жа так здараецца, што гэтая найглыбейшая, важнейшая філасофская трагедыя выклікае аднадушнае хваляванне ў гледачоў Ленінграда, Масквы або далёкіх куткоў Урала, куды мы заязджалі на гастролях нашага мінулага сезона?

Ну, вядома-ж, глядач, які ўпершыню глядзіць гэтую трагедыю, не можа зразумець усёй яе глыбіні да канца — ды і хто з нас адважыцца сцвярджаць, што ён да канца разумее ўсе яе глыбіні! Але асноўныя ідэі, якімі жыве Шэкспір, за што ён змагаецца і супроць каго ён змагаецца, — гэта аказваецца зразумелым усім совецкім гледачам, сэрцы якіх заўсёды б'юцца за ідэі чалавечага шчасця і чалавечага дастоінства.

Можна яшчэ напісаць бясконцую колькасць кніг, спрачаючыся аб асобных прыватнасцях трагедыі «Гамлет». Але хіба можна не хваляваць разам з Шэкспірам яго непрымірымай нянавісцю да фальшы, абману і каварства, якія пануюць пры двары караля Клаўдзія, хіба можна не жыць агульнымі пачуццямі разам з Гамлетам, які ў адзіночку ўстае супроць гэтага страшнага свету хлусні і парока і хоча «сваёй рукой управіць вывіхнуты век»?

Гэтыя мыслі, зусім чотка падзяляючыя ўсіх дзеючых асоб трагедыі «Гамлет» на тых, каго мы любім і тых, хто ўзбуджае нашу нянавісць, валодалі мною, калі я чатыры гады таму назад пачаў думаць аб пастаноўцы «Гамлета»; яны прадаўжалі валодаць мною, калі ў маі мінулага года мы выпусцілі нашу прэм'еру, яны не пакідаюць мяне і па сёння.

Вядома, тое, што я гавару зараз аб «Гамлеце», адносіцца і да ўсіх вялікіх твораў сусветнай драматургіі, якую мы стараліся ў нашым тэатры ўвасабляць адначасова з найбольшай аб'ектыўнасцю і найбольшым запалам. Але не спалохаўшыся складанасці «Гамлета», мы яшчэ менш маем падстаў баяцца складанасці іншых трагедый Шэкспіра, які і да гэтага часу астаецца нашым першым і галоўным другам і настаўнікам сцэны. Я гавару аб «Отэло» і аб «Ромео і Джульеце». Таксама і ў гэтых яго вялікіх трагедыях няспынна чуцен голас чалавека, які змагаецца за лепшае, што ёсць і што будзе ў чалавецтве, чуцен голас барацьбіта, ніколі не пераходзячага да бясстрасна аб'ектыўнага выкладу падзей.

Не пабаяліся мы складанасці і такой глыбокай п'есы, як «Прывидения» Ібсена, дзе скрозь словы, здавалася-б стрыманыя, здавалася-б знешне спакойныя, з такой патрасаючай сілай крычыць трагедыя аб развале сям'і, аб гібелі ўсяго, на чым грунтуецца буржуазны шлюб і буржуазны сямейны ўклад.

Тым менш маглі мы спалохацца гэтай складанасці, прыняўшыся за работу над адною з лепшых драм нашага вялікага Горкага. Мы ведалі, што вялікая і баявая тэндэнцыёзнасць, тэндэнцыёзнасць у тым лепшым і глыбокім сэнсе, у якім яе разумеюць Маркс і Энгельс, заўсёды дапаможа гледачу зрабіць свае, і правільныя, вывады з такога твору, як «Васа Жэлезнова», твора філасофска насычанага і значна больш складанага, чым гэта можа паказацца на першы погляд. Бо сама Васа Жэлезнова (выконвае засл. арт. Сашальская), падобна Булычэву, прыхозіцца часам бокам да свайго класа, бо адначасова, ненавідзячы яе за ўсё жорсткае, грубае і злобнае, чым яна дыхае, Горкі ўмее любавацца той вялікай сілай розуму і пакалечанай прагнасцю праўды, якая характэрна для гэтай непапраўна загінуўшай, але моцнай і па-свойму, нават скрозь свой цынізм, мужнай жанчыны. Гэта найтанчэйшае і найскладанейшае размеркаванне сімпатый і антыпатый, якое робіць Горкага заўсёды глыбокім рэалістам, чужым плакатнай схематычнасці і плакатнай агітацыйнасці, складае адзін з галоўных сакрэтаў, адну з галоўных прыпягальных сіл для нашай работы над яго творамі.

Мы не баяліся гэтай складанасці і ў паказе своеасаблівага і незабыўнага героя нашых дзён, якім з'явіўся на працягу ўсяго свайго жыцця, любімы нашай моладдзю, пісьменнік Нікалай Остроўскі. Па сутнасці кажучы, усё яго жыццё, як і жыццё ім створанага Паўла Карчагіна, гэта—найглыбейшая дыялектычная супярэчнасць паміж немінучым і жахлівым распадам яго цела і непагасным аптымізмам яго ніколі не згінаўшайся волі. Гэтая сіла кантраста, гэты здзіўляючы аптымізм, асуджанага на доўгае і пакутнае паміранне чалавека,—вось што сагравала, вось што хвалявала нас у нашай рабоце над інсцэніроўкай рамана «Як гартавалася сталь».

Але, зразумела, складанасць мастацкай мовы, будучы ўласцівасцю, якой я, як мастацкі кіраўнік і рэжысёр тэатра, ніколі не хацеў наўмысна ўнікаць,—не можа і не павінна быць мэтаю або неадменнай умовай творчасці. Мы думаем, што страсная ў сваім выкрыванні і ў сваіх гуманістычных спадзяваннях сатыра Фанвізіна, яго бяссмертны «Недоросль» просты не толькі для ўспрыняцця гледачоў, але ў пэўнай ступені і для артыстаў, якія прымаюцца за гэту работу, хоць, зразумела, вобраз Старадума (арт. Гурэвіч) прадстаўляе сабою ўсё-ж дастаткова складаную загадку, ды і сама Прастакова (арт. Фаусек) у трактоўцы нашага тэатра—натура больш складаная, чым гэта звычайна прынята думаць.

Але ўжо, вядома, пазбаўлен філасофскіх глыбінь Гальдоні ў сваёй чароўнай, зззючай юмарам, задорам камедыі «Слуга двух гаспадароў». І гэта не перашкаджае нам любіць гэты наш спектакль, жыццерадасны і захапляючы вясёлы.

Бадай, можам мы сказаць та[illegible] ідэі, якімі жывем мы ў[illegible] вецкага Саюза, ідэі любв[illegible] столькі арганічны і неад[illegible] сэрцаў, што і іх мы не па[illegible] назваць надта ўскладнены[illegible] нашым мыслям і пачуцця[illegible] рыётаў прабуе адказаць [illegible] такль, з якога мы пача[illegible] ролі ў сталіцы Беларус[illegible] ліна» маскоўскіх аўтаро[illegible] гэтай сталіцы, якая зн[illegible] ка ад кардона, і як[illegible] перга ад нашых [illegible] торыя нашага [illegible] творчыя сус[illegible] такога спе[illegible] му з на[illegible] салдаты [illegible] ліна [illegible] арміямі [illegible] дзец, ку[illegible] кароль Ф[illegible]

Мы пр[illegible] мы адчува[illegible] ваздачу, яка[illegible] доваму існава[illegible] поўным саст[illegible] ходзяцца ўз[illegible] званнямі зас[illegible] тт. Сашальска[illegible] еў, Злобін, См[illegible] ладых майстроў со[illegible] ляваннем і радасцю п[illegible] тай нашай першай сустрэ[illegible] нашай брацкай рэспублікі.

СЕРГЕЙ [illegible]
засл. арт. РСФСР, орд[illegible]

ВАЕННА-МАРСКІЯ СІЛЫ

Другая імперыялістычная вайна, якую распалілі фашысцкія дзяржавы-агрэсары, ужо ўцягнула ў сваю арбіту звыш поўмільярда насельніцтва зямнога шара. Адбываецца перадзел свету шляхам вайны, з карт знікаюць цэлыя дзяржавы, пазбаўляюцца незалежнасці і занявольваюцца цэлыя народы.

Адным з асноўных баявых сродкаў у гэтай вайне, як і ў мінулых войнах, з'яўляецца ваенна-марскі флот.

У грабежніцкай вайне, якую вядуць японскія імперыялісты ў Кітаі, значную ролю адыгрывае ваенна-марскі флот (абстрэл гарадоў і ўзбярэжжа буйна-калібравай марской артылерыяй, высадка дэсантаў, блакада асобных партоў і т. д.). Італія з дапамогаю флота заняволіла Абісінію і Албанію. Італа-германскі флот быў адным з сродкаў Гітлера і Мусаліні ў чорнай справе ўдушэння Іспанскай рэспублікі.

Фашысцкія агрэсары рыхтуюцца да «вялікай вайны». У шалёнай гонцы ўзбраенняў яны, напружваючы ўсе сілы і сродкі, будуюць і ваенна-марскі флот, каб пры дапамозе яго захватваць сабе калоніі, крыніцы сыравіны і рынкі збыту. Так называемыя дэмакратычныя краіны — Англія, Францыя, ЗША — таксама павялічваюць свае марскія ўзбраенні. Марское саперніцтва выклікае бесперапынную гонку марскіх узбраенняў, не абмежаваную ніякімі дагаворамі. Фашысцкія агрэсары ануліруюць існуючыя дагаворы і пагалненні. Японія разарвала Вашынгтонскае пагалненне. Зусім нядаўна Германія ануліравала англа-германскае пагалненне, па якому танаж германскага флота не павінен быў перавышаць 35 проц. танажа англійскага флота.

Ваенна-марскія сілы з'яўляюцца саставной часткай узброеных сіл краіны і ў агульнай сістэме ваенных дзеянняў супроць непрыяцельскіх узброеных сіл рашаюць першаступенныя задачы. Баявыя задачы на моры ў сілу рознастайнасці абстаноўкі ў баі патрабуюць для свайго рашэння ў кожным асобным выпадку пэўнага спосабу дзеянняў і пэўных сродкаў.

Ваенна-марскія сілы могуць:

— Ажыццяўляць усе віды аперацый (аж да поўнага разгрому) супроць непрыяцельскіх ваенна-марскіх сіл: бой вялікіх сіл, набегі падводных і надводных суднаў, налёты авіяцыі і інш.

— Перарываць марскія шляхі зносін праціўніка (гандаль, транспартыраванне войск, тавараў і сыравіны) і забяспечваць свае.

— Рабіць утаржэнні на ўзбярэжжа праціўніка шляхам высадкі дэсанта сухапутных войск з мора і з паветра.

— Дзейнічаць на фланзе і ў тылу сухапутнага фронта праціўніка, калі фронт падыходзіць да ўзбярэжжа. Гэта асабліва часта прымяняецца зараз японскімі агрэсарамі ў Кітаі.

— Ахоўваць і абаранять свае ўзбярэжжа ад удараў з мора і паветра, зрабіць немагчымай высадку дэсантаў праціўніка, аказваць падтрыманне сваім часцям, якія дзейнічаюць на ўзбярэжжы.

У выпадку значнай перавагі непрыяцельскіх марскіх сіл флот радам пасляўных рашчоўных удараў — нечаканымі набегамі эскадранных мінаносцаў, падводных лодак, налётамі авіяцыі і пастаноўкай мінных загародаў ля непрыяцельскіх берагоў можа аслабіць флот праціўніка і забяспечыць поспех сваіх далейшых аперацый.

Ваенна-марскія сілы складаюцца з флота (надводныя і падводныя караблі), марской авіяцыі і берагавой абароны. У саставе флота ўваходзяць баявыя караблі і дапаможныя судны. У залежнасці ад іх казначэння і асноўнага ўзбраення баявыя караблі ўладаюць рознымі баявымі якасцямі і адносяцца да пэўнага класа.

Самыя вялікія і самыя магутныя баявыя караблі — **лінейныя караблі** (лінкоры). Галоўнае ўзбраенне іх—артылерыя. Яны маюць ад 8 да 12 гармат калібрам да 406 міліметраў, якія страляюць на адлегласць 35—40 кілометраў. Апрача буйнай артылерыі на іх ёсць 20—30 гармат сярэдняга калібра і зенітных. Водавымяшчэнне гэтых караблёў 35—45 тыс. тон (зараз, напрыклад, у Японіі закладзены лінейныя караблі водавымяшчэннем у 45 тысяч тон і з артылерыяй калібрам да 457 міліметраў). Лінкоры адзеты ў моцную броню для аховы ад снарадаў праціўніка і тарпед. Скорасць ходу лінкораў дасягае 60 кілометраў у гадзіну. Назначэнне лінкораў — наносіць праціўніку магутныя артылерыйскія ўдары.

Крэйсеры — караблі значна меншых размераў. Іх водавымяшчэнне 5—10 тысяч тон. Крэйсеры маюць і менш сільную артылерыю, калібр якой звычайна не перавышае 203 мм. Крэйсеры ўладаюць вялікай скорасцю ходу, якая не ўступае скорасці кур'ерскага поезда (80 кілометраў). Назначэнне крэйсераў — разведка, дазорная і ахоўная служба, адбіццё тарпедных і паветраных атак, падтрыманне мінаносцаў і кацераў, пастаноўка мінных загародаў, ахова транспартаў у моры, ахова сваіх марскіх шляхоў зносін, дзеянні супроць непрыяцельскіх і артылерыйскі бой з крэйсерамі праціўніка.

Мінаносцы выконваюць рознастайныя функцыі ў саставе марскіх сіл: тарпедныя атакі, ахова галоўных сіл флота, разведка, дзеянні супроць гандлёвага флота, барацьба з падводнымі лодкамі і ў некаторых выпадках садзеянне сухапутным войскам. Скорасць ходу мінаносцаў да 80 кілометраў у гадзіну. Галоўнае ўзбраенне мінаносцаў — тарпеды. Апрача тарпедных апаратаў мінаносцы ўзброены 3—4 пушкамі сярэдняга калібра. Мінаносцы вялікага размеру паступова набліжаюцца да класа лёгкіх крэйсераў. Водавымяшчэнне мінаносцаў хістаецца ў межах ад 1.300 да 3.000 тон.

Імперыялістычная вайна 1914—1918 гг. паказала велізарнае значэнне для вядзення марскіх аперацый новага віду зброі — **падводных лодак**. Германскія падводныя лодкі, прымяняючы піратскія спосабы нападу, патапілі сотні караблёў і пастаянна пагражалі шляхам зносін англійскага флота. У сучаснай вайне падводныя лодкі будуць прымяняцца ў шырокіх маштабах. Тэхніка падводнага суднабудаўніцтва за апошні час пайшла далёка ўперад і дазваляе падводным лодкам выконваць любыя аператыўныя заданні і знаходзіцца ў плаванні далёка ад сваёй базы да 2-х месяцаў. Галоўная зброя падводных лодак — тарпеды. Водавымяшчэнне падводных лодак звычайна не перавышае 2.500 тон.

Апрача мінаносцаў для тарпедных атак праціўніка прымяняюцца **тарпедныя кацеры**. Гэтыя невялікія караблі з скорасцю ходу да 100 кілометраў у гадзіну, узброеныя 2 тарпедамі і кулямётам, прадстаўляюць сур'ёзную небяспеку нават для буйных лінейных караблёў.

Асаблівая ўвага ў замежных флотах аддаецца класу **авіяносцаў**. Караблі гэтага класа прадстаўляюць сабой плывучыя аэрадромы марской авіяцыі і нясуць на сабе да 135 самалётаў. Па сваіх размерах, скорасці ходу і водавымяшчэнню яны з'яўляюцца пасля лінейных караблёў найбольш буйнымі баявымі адзінкамі. Авіяносцы, знаходзячыся ў саставе эскадры, павялічваюць радыус дзеяння марской авіяцыі.

Флот мае ў сваім саставе рад іншых караблёў (мінныя заградзіцелі, тральшчыкі, вартавыя караблі, кананерскія лодкі, плывучыя базы і інш.). Назначэнне гэтых караблёў — садзейнічаць баявому поспеху флота ў цэлым.

Марскую авіяцыю складаюць розныя віды самалётаў — як ацнатышныя з сухапутнымі (бамбардыроўшчыкі, знішчальнікі, разведчыкі, штурмавікі), так і спецыяльныя (тарпеданосцы). Назначэнне марской авіяцыі — нанясенне магутных удараў з паветра па наземных, надводных і падводных аб'ектах, барацьба з паветраным праціўнікам за перавагу ў паветры, разведчыя і іншыя дзеянні.

Берагавая абарона абараняе базы флота, буйныя эканамічныя і палітычныя цэнтры ўзбярэжжа, важныя ў ваенных адносінах марскія рубяжы і праліўы ад нападу марскога і паветранага праціўніка. Берагавая абарона складаецца з буйнай рухомай і станцыйнай (устаноўленай на бетонных пляцоўках) артылерыі, сярэдняй, дробнай і зенітнай артылерыі, сухапутных часцей, прыданых караблёў, пастоў нападу, аховы, сувязі і інш. Берагавая абарона дзейнічае сумесна з флотам, сухапутнымі войскамі і авіяцыяй.

Але галоўным элементам боездольнасці любога ваеннага карабля і флота ў цэлым з'яўляецца яго асабовы састаў, кадры, людзі, якія ўпраўляюць усёй складанай баявой тэхнікай флота.

* *

Совецкі Саюз уладае велізарнымі марскімі граніцамі працяжэн[illegible] 47.000 кілометраў.

Выступаючы на Першай [illegible] нага Совета СССР, тав. Мо[illegible] «Мы павінны лічыцца з [illegible] на наша вялікая, што яна [illegible] рамі на велізарным праця[illegible] нам заўсёды напамінае [illegible] флот у нас павінен быць [illegible] Аб гэтым-жа нам напамі[illegible] лістычныя дзяржавы [illegible] нія годы яны разгр[illegible] марское будаўні[illegible] вацца роўнам[illegible] больш, [illegible] ніяк не [illegible] некатор[illegible] марскі[illegible]

Пра[illegible] наша[illegible] акіяне[illegible] гутнай [illegible] ворага[illegible]

Бол[illegible] тральш[illegible] Сталі[illegible] аказве[illegible] тву і [illegible] та СС[illegible] прам[illegible] выс[illegible] «Н[illegible] адно[illegible] вяз[illegible] М[illegible] р[illegible]



ВЯСНА НА БАЛТЫЦЫ. НА ЗДЫМКУ: фізкультурная зарадка на лінкоры «Кастрычніцкая рэволюцыя».
Фота Э. Хайкіна (Фотахроніка ТАСС).

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

На фронце ў Цэнтральным Кітаі прадаўжаецца зацішша. Вялікіх баёў няма. Асобныя баі кітайскіх войск і партызан з японцамі адзначаюцца ў паўднёва-ўсходняй частцы правінцыі Хубэй. У гэтай частцы Кітая адбываюцца баі ў раёне Наньліньцзяо. Японскі гарнізон, размешчаны ў гэтым горадзе, акружан кітайскімі часцямі. Японцы, прабуючы правесці вылазку, страцілі 400 чалавек. У сектары Туншань—Цзун Ян адзначаецца вялікая актыўнасць кітайскіх партызан, якія безупынна атакуюць японцаў.

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

У паўднёва-заходняй частцы правінцыі Шаньсі прадаўжаюцца баі на поўнач ад Маоцзіндун. Японцы прабуюць прарваць лінію абароны кітайскіх войск, але поспеху не маюць, не гледзячы на прымяненне атрутных вяшчэстваў.

На розных участках фронта ў гэтай частцы правінцыі Шаньсі японцы нясуць вялікія страты. За апошнія тры дні з раёнаў, Ань-У, Юнь-Чэн і іншых японцы адправілі ў тыл звыш 3 тысяч раненых японскіх салдат. Апрача таго адпраўлена для крэмацыі 5 тысяч забітых японцаў.

Гэтымі днямі супроць японцаў паўстаў 3-тысячны атрад мабілізаваных мясцовых жыхароў. Паўстанне адбылося ў раёне Ліньцзінь. Паўстаўшыя вядуць баі з японцамі.

У ПАЎДНЁВЫМ КІТАІ

На фронце ў Паўднёвым Кітаі зацішша.

ПРАБЫВАННЕ ГАФЕНКУ Ў АНКАРЫ

АНКАРА, 18 чэрвеня. (ТАСС). Як паведамлялася ўжо, днямі румынскі міністр замежных спраў Гафенку паведаў Анкару. У часе прабывання ў Анкары Гафенку быў прынят прэзідэнтам Турэцкай рэспублікі Ісметам Іненю і вёў перагаворы з турэцкім міністрам замежных спраў Шукру Сараджоглу.

Як паведамляе Анаталійскае агенцтва, на афіцыяльным банкеце, наладжаным у чэсць Гафенку, турэцкі і румынскі міністры замежных спраў выступілі з прамовамі. Шукру Сараджоглу, закранаючы ў сваёй прамове пытанне аб значэнні Балканскай Антанты, сказаў, што Балканская Антанта стала і астанецца інструментам міру, «якія-б ні былі паслядоўныя падзеі».

У спецыяльнай заяве, зробленай для друку, Гафенку падкрэсліў, што ў рэзультаце перагавораў, якія вяліся паміж ім і Сараджоглу, дасягнута згода і абмеркаваны ўсе пытанні «ў адпаведнасці з міжнароднай палітыкай, якая датычыць безапаснасці і незалежнасці Балкан».

* * *

БЕРЛІН, 18 чэрвеня. (ТАСС). Германскі друк удзяляе вялікую ўвагу рэзультатам візіта румынскага міністра замежных спраў Гафенку ў Анкару. Газеты не скрываюць яўнага незадаволення па поваду гэтай паездкі румынскага міністра і яго заявы прадстаўнікам друку. З асаблівым раздражэннем фашысцкі друк выступае супроць Турцыі і Англіі.

* * *

АФІНЫ, 18 чэрвеня. (ТАСС). Грэчаскае тэлеграфнае агенцтва перадае афіцыяльнае камюніке, у якім гаворыцца, што ў часе свайго прабывання ў Афінах 15 і 16 чэрвеня міністр замежных спраў Румыніі Гафенку меў некалькі гутарак з старшынёй савета міністраў і міністрам замежных спраў Грэцыі Метаксасам. Перагаворы, якія адбываліся паміж Метаксасам і Гафенку, гаворыцца далей у камюніке, пацвердзілі згоду абодвух краін па пытаннях, непасрэдна іх цікавячых.

СТАНОВІШЧА Ў ЧЭХА-СЛАВАКІІ

ЛОНДАН, 18 чэрвеня. (ТАСС). Спецыяльны карэспандэнт газеты «Сендэй экспрэс» паведамляе з Прагі, што каля 10 германскіх дывізій сканцэнтраваны ў Остраве, на граніцы з Славакіяй. Карэспандэнт сцвярджае, што па тайнаму пагадненню з Венгрыяй Германія намерана акупіраваць частку славацкай тэрыторыі, да ракі Ваг, а Венгрыя захваціць астатнюю тэрыторыю.

На працягу апошніх 10 дзён немцы ўсяляк правацыруюць інцыдэнты ў Чэха-Славакіі, каб мець повад для аб'яўлення «пратэктарата» правінцыяй Германіі.

* * *

ПА, 18 чэрвеня. (ТАСС). Становішчам германскімі войскамі Чэхія і Маравія» ста- льш напружаным.

едні ліст» публікуе сёння германскіх акупацыйных (на паўночны ўсход ад чэшскае насельніцтва абві- «антыдзяржаўных дзеян- ясні, у прыватнасці, вы- , што нямецкія шыльды аваюцца і пакрываюцца ахпісамі» або нават увязі з гэтым гер- ўраздзе прыля- асобае стано- зін раніцы ь жылля і паяўляцца на вуліцах. Забараняецца таксама ўсякі рух па шасейных дарогах. Нарушаючыя гэтыя правілы падвяргаюцца неадкладнаму арышту і грашоваму штрафу да 10 тысяч крон. Германскія ўлады пагражаюць чэшскаму насельніцтву яшчэ больш строгімі карамі.

У сувязі з меўшай месца 8 чэрвеня сутычкай паміж чэхамі і немцамі ў часе футбольнага матча паміж камандамі Берліна і Прагі (матч закончыўся паражэннем немцаў) улады выдалі распараджэнне аб забароне да 30 чэрвеня ўсякіх грамадскіх сходаў.

Газета «А-Зет» сёння пацвярджае весткі аб тым, што германскія ўлады закрылі ўсе граніцы «пратэктарата Чэхія і Маравія». Праезд праз граніцу дазваляецца толькі ў выключных выпадках.

* * *

ПАРЫЖ, 19 чэрвеня. (ТАСС). У французскім друку паведамляецца, што германскі ўрад вядзе перагаворы з венгерскім урадам па пытанню аб падзеле Славакіі — зараз намінальна «аўтаномнай рэспублікі», якая знаходзіцца пад пратэктаратам Германіі.

Лонданскі карэспандэнт газеты «Жур эко дэ Пары» піша: «Атрыманы вельмі дакладныя весткі аб германа-венгерскіх перагаворах, якія не пакідаюць сумненняў адносна далейшага лёсу Славакіі».

РОНІКА

я газета оўца дзве дарога —Каір з

50 англійскіх і нарвежскіх урачоў, якія працавалі ў рэспубліканскай Іспаніі, прыбываюць у Кітай для работы ва ўстановах кітайскага Чырвонага Крыжа.

БЛАКАДА ЗАМЕЖНЫХ КАНЦЭСІЙ У ЦЯНЬЦЗІНЕ І ГУЛАНСУ

НЬЮ-ЁРК, 18 чэрвеня. (ТАСС). Сёння газета «Геральд трыбун» у перадавым артыкуле прапануе ЗША парваць дыпламатычныя і гандлёвыя адносіны з Японіяй, калі апошняя будзе прадаўжаць блакаду замежных канцэсій у Цяньцзіне і Гулансу. Газета падкрэслівае, што японская блакада з'яўляецца фактычна ваенным актам і, незалежна ад таго, якую пазіцыю зойму Англія і Францыя, ЗША павінны ў рашучай форме заявіць Японіі, што яе мерапрыемствы супроць міжнародных сетльментаў у Кітаі і асабліва марскія аперацыі ў Гулансу з'яўляюцца ваеннымі мерамі. Вашынгтон, піша газета, павінен адкрыта заявіць Японіі, што ЗША не прывыклі падтрымліваць прыяцельскія дыпламатычныя і гандлёвыя адносіны хоць-бы на прапягу аднаго дня з краінамі, ваюючымі супроць іх.

Газета «Нью-Ёрк таймс» піша, што японская блакада ў Цяньцзіне, відавочна, з'яўляецца пачаткам шырокай кампаніі за выгнанне заходніх дзяржаў з Кітая. Газета ўказвае, што Англія больш іншых заходніх дзяржаў зацікаўлена ў становішчы на Далёкім Усходзе. Калі Англія будзе вымушана адступіць пад даўленнем Японіі, то іншыя заходнія дзяржавы павінны будуць паследаваць яе прыкладу. Англійская капітуляцыя ў Цяньцзіне, у асаблівасці пасля Мюнхена, нанясе вялікую шкоду англійскім пазіцыям і заахвоціць Японію да знішчэння іншых дагаворных правоў заходніх дзяржаў у Кітаі.

* * *

ЛОНДАН, 19 чэрвеня. (ТАСС). Па апошніх вестках з Цяньцзіня, мясцовыя японскія ваенныя ўлады аб'явілі што, пачынаючы з 19 чэрвеня пасля поўдня, праз дроцавыя загаролы, якія акружаюць англійскую і французскую канцэсіі, будзе прапушчан электрычны ток напражэннем у 220 вольт.

КІТАЙСКАЯ ГАЗЕТА АБ А. М. ГОРКІМ

ЧУНЦЫН, 19 чэрвеня.(ТАСС). «Аб'еднаная газета Чунцына» ў перадавым артыкуле, прысвечаным трэцяй гадавіне з дня смерці Горкага, піша: «Веліч Горкага ў тым, што ўсё яго жыццё поўна барацьбы за шчасце працоўных і стварэнне новага грамадства». Газета ўказвае, што народы Савецкага Саюза адзначаюць трэцюю гадавіну з дня смерці А. М. Горкага ў абстаноўцы паспяховага выканання трэцяга пяцігадовага плана.

У канцы артыкула ўказваецца на найвялікшыя сімпатыі Горкага да нацыянальна-вызваленчай барацьбы кітайскага народа.

Трэцяя гадавіна з дня смерці Горкага шырока адзначалася ў Чунцыне і іншых гарадах Кітая.

Асацыяцыя кітайскіх пісьменнікаў адпраўляе на фронт 15 пісьменнікаў і дрэматургаў з мэтай збору матэрыялу для калектыўнай кнігі аб вызваленчай вайне кітайскага народа. Кітайскія журналы выпускаюць спецыяльныя нумары, прысвечаныя А. М. Горкаму.

ГІБЕЛЬ ФРАНЦУЗСКАЙ ПАДВОДНАЙ ЛОДКІ „ФЕНІКС"

ПАРЫЖ, 18 чэрвеня. (ТАСС). Знікненне французскай падводнай лодкі «Фенікс» глыбока ўсхвалявала французскую грамадскую думку. Указваюць, што лодка загінула неўзабаве пасля пажару, знішчыўшага вялізарны французскі акіянскі параход «Парыж», і следам за гібеллю амерыканскай падводнай лодкі «Сквалус» і англійскай «Тэціс». Ва Францыі шырока распаўсюджана перакананне, што ўсе гэтыя катастрофы, якія адбыліся на працягу менш чым аднаго месяца, з'яўляюцца рэзультатам арганізаванага фашысцкага шкодніцтва, правадзімага ў міжнародным маштабе і накіраванага супроць Англіі, Францыі і ЗША.

30 мая дан старт велапрабегу ўдзельнікаў баёў ля возера Хасан па маршруту сопка Заазёрная — Заходняя граніца СССР. НА ЭДЫМКУ: удзельнікі велапрабегу на прывале ў гор. Спаску (Ўсурыйская вобласць, Прыморскі край). Злева направа—тт. Баканаў, Федасеў, Ціханаў (камандзір і палітрук прабегу), Гогалеў і Кошалеў.

Фото Н. Шкуліна (Фотахроніка ТАСС).

АДКРЫЦЦЁ САНАТОРНАГА ЛАГЕРА „РАТАМКА"

На ўзгорку ля густога лесу ўзвышаецца дом. Гэта адзін з сямі карпусоў санаторнага лагера «Ратамка» Менскага аддзела аховы здароўя.

У лагеры, гэтым сапраўдным гарадку здароўя, знаходзяцца 424 піонеры і школьнікі. Яны акружаны сталінскімі клопатамі. Тут усе ўмовы для вясёлага і здаровага адпачынку.

Увесь дзень запоўнен цікавым зместам, захапляючымі заняткамі. Дзеці добра сябе адчуваюць. Іх твары пакрыліся загарам. Многа часу дзеці знаходзяцца ў лесе, дзе весяляцца, слухаюць гутаркі ўрача, развучваюць песні, танцы. Вечарам у зялёным тэатры, на сталыёне — канцэртныя выступленні, паказ самадзейнасці, спартыўныя спаборніцтвы.

Пяць разоў у дзень дзеці атрымліваюць харчаванне. За 10 дзён прабывання ў лагеры многія рэбяты прыбавіліся ў вазе ад 1 кг. 600 гр. да 3 кг. 200 гр.

Санаторны лагер «Ратамка» — адна з лепшых дзіцячых здраўніц рэспублікі. Яго бюджэт складае каля поўмільёна рублёў. У кнізе водгукаў многа запісаў бацькоў, якія выказваюць пазяку партыі і ўраду за вялікія клопаты аб здароўі шчаслівых савецкіх дзяцей.

* * *

18 чэрвеня ў прысутнасці прадстаўнікоў партыйных і савецкіх арганізацый Менска і шматлікіх гасцей адбылося ўрачыстае адкрыццё лагера.

М. КІН.

ВЫЕЗД ВУЧОНЫХ У ЧЫРВОНААРМЕЙСКІЯ ЛАГЕРЫ

У выходны дзень, 18 чэрвеня, Дом Чырвонай Арміі імені К. Е. Варашылава разам з ваенна-пэфскай камісіяй навуковых работнікаў Менска арганізавалі масавы выезд вучоных у чырвонаармейскія лагеры. У гэты дзень да чырвонаармейцаў прыехалі 35 прафесароў і навуковых работнікаў вышэйшых навучальных устаноў сталіцы БССР. З раніцы ў Н-скую часць прыбыла 9 навуковых работнікаў. Прафесар Ракаў прачытаў лекцыю на тэму «Электрыфікацыя БССР», навуковы работнік тав. Лочмель — на тэму «Разгром Напалеона», тав. Грынблат — «Чырвоная Армія — у народнай творчасці», тав. Марозаў — «Паходжанне жыцця на зямлі» і т. д. Байцы і камандзіры асталіся вельмі задаволены лекцыямі.

У гэты-ж дзень навуковы работнік тав. Зеленаў прачытаў лекцыю на тэму «Жыццё і творчасць Горкага», тав. Зудзілін—аб міжнародным становішчы».

Такія выезды вучоных у чырвонаармейскія лагеры праводзяцца кожны выходны дзень. З пачатку лагернага збора вучонымі прачытана ў лагерах каля 80 лекцый на грамадска-палітычныя і літаратурныя тэмы.

ЭКСКУРСІЯ ПЕДАГОГАЎ БССР

48 лепшых педагогаў БССР выехалі ў экскурсію на Беламорска-Балтыйскі канал імені Сталіна і ў гарады Савецкага Запаляр'я — Мурманск і Кіраўск. Турысты азнаёмяцца з сістэмай шлюзаў, гісторыяй будаўніцтва канала. У Мурманску экскурсанты агледзяць самую паўночную ў свеце Туломскую гідрастанцыю, зробяць экскурсію ў тундру, дзе азнаёмяцца з флорай і фаунай Запаляр'я. У Кіраўску экскурсанты наведаюць апатытавы рудзік, абагачальную фабрыку і т. д. Падарожжа прадоўжыцца 18 дзён.

І. ХЕЙФЕЦ.

3:2 У КАРЫСЦЬ КІЕВА

18 чэрвеня на менскім стадыёне «Дынама» імені Кірава адбыўся футбольны матч на першынства СССР па групе «Б» паміж камандамі «Спартак» (Менск) і «Ламаматыў» (Кіеў).

На другой мінуце спартакаўцы імклівым прарывам адкрываюць шчот. Але няўдалая ігра вратара Ацадоўскага дае магчымасць кіеўлянам адразу-ж забіць адказны гол.

У другім тайме ігра вялася пераважна ля варот Менска. Асноўная ўвага спартакаўцаў была сканцэнтравана на абароне. Гэта вырашыла вынік сустрэчы, якая закончылася са шчотам 3 : 2 у карысць кіеўлян.

На матчы прысутнічалі сакратар ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка і сакратар Менскага абкома КП(б)Б тав. Матвееў.

(БЕЛТА).

АБМЕРКАВАННЕ ПЫТАННЯЎ КРЫТЫКІ

Днямі на пашыраным пасяджэнні праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР з актывам абмяркоўваліся пытанні крытыкі. Пісьменніцкая грамадскасць была падрыхтавана да пастаноўкі гэтага пытання дакладамі і артыкуламі тав. Фадзеева і неаднаразовымі выступленнямі «Правды». Аднак, не гледзячы на гэта, пытанне аб крытыцы на пасяджэнні праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў абмеркавана досыць павярхоўна. Пісьменніцкі актыў на гэтым пасяджэнні адсутнічаў.

Бясспрэчна, што крытыка прарабіла за апошнія годы вялікую работу, распрацавала многа новых і арыгінальных тэм. Папоўніліся кадры крытыкаў. Аб гэтым гаварыў у сваім уступным слове тав. Лынькоў, гэта адзначылі ў сваіх дакладах тт. Клімковіч і Шарахоўскі і многія выступаўшыя. Але сапраўднае становішча крытыкі не прааналізавана на гэтым пасяджэнні нікім з прысутных. Больш таго, асобныя крытыкі прысвяцілі свае выступленні звядзенню старых разлікаў з сваімі літаратурнымі працаўнікамі, каб адвесці ўвагу прысутных ад сваіх уласных памылак і недахопаў. Такім было выступленне тав. Ларчанкі. Тав. Кучар скардзіўся на зняважлівыя адносіны да крытыкаў з боку пісьменнікаў, выдавецтва і рэдакцый газет. У той-жа час сам тав. Кучар прапягваў думку, што ў нас, у Беларусі, ёсць толькі 3—4 крытыкі, астатнім трэба, моў, забаранёць пісаць аб літаратуры.

Крытык Бярозкін зусім правільна адзначыў у сваім выступленні, што найбольш зняважлівыя адносіны да крытыкі, як нідзіўна, наглядаюцца ў асяродзі пісьменнікаў. Гаворачы аб становішчы крытыкі, тав. Бярозкін прыводзіць прыклады несур'ёзных адносін асобных крытыкаў да сваёй справы. Ён крытыкуе артыкулы тав. Моделя за іх няшчырасць і нізкі ўзровень, за аглядку т. Моделя на ранг і званне крытыкуемых. Рэзка крытыкуе т. Бярозкін рэдакцыю газеты «Літаратура і мастацтва» за недастатковую работу з крытыкамі. Ён прыводзіць прыклады, калі і рэдакцыя «Звязды» друкуе падчас нізкай якасці рэцэнзіі, артыкулы.

З невялікай, але змястоўнай прамовай выступіў пісьменнік Кандрат Крапіва. Тав. Крапіва адзначыў, што многім крытыкам нехапае культуры, ведаў, і яны запаўняюць свае артыкулы ўсялякімі славесными пабракушкамі, хаваючы за гэтым сваю непісьменнасць.

У спрэчках выказаліся таксама тт. Ільінскі, Сярэбраны, Грубіян.

Закрываючы пасяджэнне, тав. М. Лынькоў адзначае, што абмеркаванне пытанняў крытыкі магло-б прайсці куды больш дзелавіта і сур'ёзна, калі-б праўленне ССПБ і пісьменніцкі актыў добра падрыхтаваліся да гэтай справы. Але гэтага не было, і пасяджэнне не вырашыла ўсіх задач, якія перад ім стаялі.

Я. ГЕРЦОВІЧ.

ЗАВОДЫ БЕЛТОРФА ЗА 18 ЧЭРВЕНЯ

(Выпуск прадукцыі ў тонах)

	План	Здабыта	% плана
Асінторф	4.458	4.650	104.0
Чырвоны сцяг	850	642	75,5
Ім. Орджанікідзе	2.076	271	13,1
Ім. Даумана	274	207	75,5
Свабода	542	300	55,5
Лукское	392	372	95,0
Дукора	396	457	115,2
Татарка	554	547	98,8
Радзічава	164	30	18,3
Міханавічы	274	324	118,0
УСЯГО	9.980	7.800	78,2

В. а. адказнага рэдактара Д. Т. ЛЕБЕДЗЕЎ.

МЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ТРАНСЛЯЦЫЙНАЯ РАДЫЁСЕЦЬ ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ЎЛАДАЛЬНІКАЎ РАДЫЁТОЧАК, што, згодна пастановы СНК СССР ад 22 красавіка 1939 года № 545,

плата за карыстанне радыёточкай

з 1 красавіка г. г. устаноўлена ў размеры 4 руб. у месяц.

УЛАДАЛЬНІКІ РАДЫЁТОЧАК, ЯКІЯ ЗАПЛАЦІЛІ ЗА ДРУГІ КВАРТАЛ І ЎПЕРАД, АБАВЯЗАНЫ З'ЯВІЦЦА Ў РАЁННЫЯ КАСЫ БЕЛКОМУНБАНКА ДЛЯ ПЕРАРАЗЛІКУ.

АПОШНІ ТЭРМІН аплаты за ліпень месяц — 22 чэрвеня.

Уладальнікі радыёточак, якія не з'явіліся для пераразліку і не заплацілі да ўказанага тэрміна, ВУДУЦЬ ВЫКЛЮЧАНЫ З СЕЦІ.

НКАЗ БССР

Менская двухгадовая школа медсясцёр

АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР

на 1939—40 вучэбны год на першы курс.

Скончыўшыя 2 курсы школы атрымліваюць сярэднюю медыцынскую асвету з званнем медыцынскай сястры.

Прынятымі ў лік слухачоў могуць быць дасягнуўшыя 16-гадовага ўзросту і скончыўшыя не менш 7 класаў сярэдняй школы.

Для паступлення неабходна прадставіць у канцылярыю школы атэ- аб асвеце, метрыку, 2 фотакарткі, аўтабіяграфію, заяву, паштовых на 60 кап.

тыя экзамены з 15 жніўня па рускай і беларускай мовах мова), матэматыцы, арыфметыцы, алгебры, геаметрыі, фі- і Канстытуцыі па праграме 7 класаў сярэдняй школы. ыя сямігодку на «выдатна» прымаюцца без прыёмных іс-

у лік слухачоў забяспечваюцца стыпендыяй згодна па-

школа не прадастаўляе, прыязджаючым аплачваюцца ны ў размерах, прадугледжаных пастановай урада.

прымаюцца з 1 чэрвеня 1939 г. у канцылярыі школы ад. 30 мін. дня, апрача выходных) і поштай.

Менск, 7 лінія, № 29 (Лагойскі тракт).

АЯ КАНТОРА ГАЛОЎМЕТАЛАЗБЫТА

АВЕДАМЛЯЕ, ШТО чэрвеня г. г. АДКРЫТ

ПАД РОЗНІЧНАГА ГАНДЛЮ

ЕТАЛАМ

АВОДЗІЦЦА КАЛГАСАМ, СОЎГАСАМ, ДАМАМ СОЦ- ДЗІЦЯЧЫМ САДАМ І ЯСЛЯМ, ДОМАЎПРАЎЛЕН- РАЙМАГАМ, СЕЛЬМАГАМ І ПРАДПРЫЕМСТВАЎ па адпаведных патрабаваннях.

спажыўцам для іх уласных гаспадарчых патрэ ных сельсоветам, калгасам або домаўпраўленням.

ОДЗІЦЦА ЗА НАЯЎНЫ РАЗЛІК.

А: МЕНСК, НІЗАВАЯ ВУЛІЦА, СКЛАД РОЗНІЧ- ГАЛОЎМЕТАЛАЗБЫТА.

ГАЛОЎМЕТАЛАЗБЫТ.

Упраўленне ДЗЯРЖСТРАХА НКФ БССР

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА УСІХ ГРАМАДЗЯН, што на падставе пастановы Эканомсавета пры СНК СССР ад 26 красавіка 1939 года за № 384 раённыя страхавыя інспекцыі праводзяць РЭГІСТРАЦЫЮ І ПЕРААЦЭНКУ БУДЫНКАЎ У СЕЛЬСКІХ МЯСЦОВАСЦЯХ БССР для мэт абавязковага акладнога страхавання.

ДОМАЎЛАСНІКІ ПАВІННЫ ЗАЯВІЦЬ АБ УСІХ МАЮЧЫХСЯ У ІХ БУДЫНКАХ І ПРЫСУТНІЧАЦЬ ПРЫ ІХ АЦЭНЦЫ.

Ацэнка будынкаў робіцца абавязкова ў прысутнасці прадстаўніка сельсовета.

Адначасова з пераацэнкай будынкаў страхавыя інспектары ПРЫМАЮЦЬ

ДАБРАВОЛЬНАЕ СТРАХАВАННЕ Ў КАЛГАСАЎ:

будынкаў, інвентара, транспартных сродкаў, прамысловых прадпрыемстваў, пасеваў спецыяльных, тэхнічных, зернавых і бабовых культур, а таксама ўраджай садоў, ягаднікаў, вінаградникаў і агародаў.

У КАЛГАСНІКАЎ, РАБОЧЫХ, СЛУЖАЧЫХ І ІНШЫХ ГРАМАДЗЯН:

дабравольнае страхаванне ДАМАШНЯЯ МАЕМАСЦІ—

абстаноўка, вопратка, музыкальныя інструменты, веласіпеды, запасы с.-г. прадуктаў, кармы (сена, салома), дамашняя птушка, маладняк жывёлы і інш. маёмасць можа быць застрахавана ў поўным кошце.

Плацяжы спаганяюцца ад 1 да 9 рублёў у год за кожную 1000 рублёў страхавой сумы.

Дабравольнае (звышакладное) страхаванне сельгас. жывёлы.

Могуць быць застрахаваны: буйная рагатая жывёла, авечкі, козы, свінні за ўзросце ад 6 месяцаў, коні ад 1 года.

Забяспечвайце сваю маемасць ДАБРАВОЛЬНЫМ СТРАХАВАННЕМ!

За даведкамі і раз'ясненнямі звяртайцеся ў раённыя і гарадскія інспекцыі Дзяржстраха (рай-гарфа) і да страхавых агентаў.

УПРАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖСТРАХА НКФ БССР.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНІЦЕ ПА ТЭЛЕФОНУ № 21-845

Віцебскі фінансава-эканамічны тэхнікум НКФБ

АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР СТУДЭНТАЎ

НА 1939-40 ВУЧЭБНЫ ГОД НА ПЕРШЫ КУРС.

Тэхнікум рыхтуе спецыялістаў фінансавай сістэмы: а) інспектараў-бухгалтараў па дзяржстрахаванню для райфа; б) інспектараў-бухгалтараў для райашчадкас.

У тэхнікум прымаюцца асобы не менш 15-гадовага ўзросту, скончыўшыя НСШ або 7 класаў СШ.

Паступаючыя ў тэхнікум падаюць заяву на імя дырэкцыі тэхнікума з прыкладаннем наступных дакументаў: аб узросце, аб адносінах да воінскага абавязку (для мужчын), аб адукацыі (абавязкова ў арыгінале), аб стане здароўя, дзве фотакарткі і марак на 60 кап.

Усе паступаючыя трымаюць іспыты па Канстытуцыі, беларускай і рускай мовах, геаграфіі, матэматыцы (арыфметыка, алгебра, геаметрыя).

Асобы, скончыўшыя 7-годку або 7 класаў СШ з ацэнкай «выдатна» па асноўных прадметах, прымаюцца без іспытаў.

Асобы, залічаныя ў тэхнікум, поўнасцю забяспечваюцца інтэрнатам, а стыпендыяй—у залежнасці ад паспяховасці.

Прыём заяў да 15 жніўня.

Заявы падаваць па адрасу: г. Віцебск, 1 Валадарская, № 27, другі паверх, фінансава-эканамічны тэхнікум.

Іспыты — з 15 жніўня. На іспыты з'яўляцца толькі па выкліку.

Пачатак заняткаў — 1 верасня.

ДЫРЭКЦЫЯ.

БЕЛКААПСАЮЗ

БАЦЬКІ І ВУЧНІ!

ПРАДАВАЙЦЕ

патрыманыя стабільныя

ПАДРУЧНІКІ

магазінам спажыўкааперацыі БССР

ПАКУПКА праводзіцца ва ўсіх культмагах, сельмагах, раймагах і цэнтральных крамах сельпо БССР.

УМОВЫ ПАКУПКІ вывешаны ў магазінах спажыўкааперацыі.

БЕЛКААПСАЮЗ

Патрэбны пакоі

ДЛЯ КУРСАНТАЎ- НАСТАЎНІКАЎ тэрмінам на 2 месяцы. З прапановамі звяртацца ў інстытут павышэння кваліфікацыі настаўнікаў — гор. Менск, вул. Пушкіна, 75 (тэрыторыя былой выстаўкі, першы корпус). Тэл. 25-861.

Адміністрацыя, мясцком і калектыў работнікаў Белхозмедснаба НК аховы здароўя БССР выражаюць глыбокае спачуванне галоўнаму бухгалтару КАЧЭРЫНУ Б. С. у пасцігнутым яго горы — смерці дачкі СВЕТЛАНАЧКІ.

Адміністрацыя, партарганізацыя, мясцком і калектыў работнікаў Белгалоўмаслапрома выражаюць спачуванне тав. ВЕТРОВУ А. І. па поваду смерці яго МАЦЕРЫ.

Адміністрацыя, партарганізацыя, мясцком і калектыў работнікаў Белгалоўмаслапрома выражаюць спачуванне тав. РЭЙНГАРД В. Э. па поваду смерці яго МАЦЕРЫ.

Менск, друкарня «Звязды», Савецкая, 49.

М., М., Ш.